ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 69 (2429)
2 верасня 1969 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

«ЛІДЧАНКА» Ў МАСКВЕ

Лепшыя самадзейныя калектывы нашай рэспублікі часта госцяць у масквічоў. Пяць дзён быў у сталіцы ансамбль песні і танца Лідскага гарадскога Дома культуры — «Лідчанка» (мастацкі кіраўнік і дырыжор В. Аламаха).

Гэта было захапляючае, радаснае падарожжа. На цэнтральнай плошчы Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі сто самадзейных артыстаў (хор, аркестр, танцавальная група) наладзілі два канцэрты.

Прыгожыя нацыянальныя касцюмы і майстэрскае выкананне выклікалі буру воплескаў. Многія нумары выконваліся на «біс».

Лідчане для свайго справаздачнага канцэрта ў Маскве падрыхтавалі цікавую праграму. Хор у суправаджэнні аркестра натхнёна праспяваў «Прывітальную» П. Шыдлоўскага, песню пра Леніна «Ён нарадзіўся вясной» І. Лучанка, а таксама песні «Беларусь, дарагая мая» А. Граса, «Партызанскі край» І. Кузняцова.

Цёпла сустрэлі гледачы музычна-харэаграфічную кампазіцыю «Наш горад» (пастаноўка А. Конанава), якая ішла ў суправаджэнні хору і аркестра. Хор праспяваў песні кампазітараў А. Шылдлоўскага «Там, дзе ціха-ціха» і В. Аламахі «Ліда мілы, добры горад». Танцоры добра выканалі іскрыстыя «Крыжачок», імклівую «Беларускую польку», лірычны карагод «Ябланька», рускі танец «Карабейнікі».

З поспехам выступалі вакальныя дуэты, жаночы вакальны квінтэт, мужчынская вакальная група і салісты.

Масквічам спадабаўся ансамбль песні і танца «Лідчанка». Цэнтральнае тэлебачанне наладзіла спецыяльную перадачу яго канцэрта для Масквы і вобласці. Гэты канцэрт у запісе будзе перададзены па Цэнтральным тэлебачанні яшчэ раз у пачатку верасня.

БЕЛАРУСКІМ ЛІТАРАТУРНЫМ ВЫДАННЯМ — БОЛЬШУЮ ЎВАГУ

Ёсць у савецкіх людзей адна своеасаблівая рыса — вялікая цяга да друкаванага слова. І сапраўды, у нашай краіне чытаюць усе, чытаюць у самалётах і цягніках, парках і скверах, у дамах адпачынку і ў час рабочых перапынкаў.

У наш імклівы, насычаны бурнымі падзеямі час, калі тэлетайпныя стужкі даносяць усё новыя і новыя звесткі пра класавыя бітвы ў самых розных кутках нашай планеты, калі ў свеце, як ніколі, абвастрылася барацьба ідэй, савецкі друк шырока інфармуе сваіх чытачоў пра палітыку нашай партыі на міжнароднай арэне, падрабязна асвятляе пытанні камуністычнага будаўніцтва і развіцця культуры ў нашай краіне.

Камуністычная партыя і савецкі ўрад пастаянна клапоцяцца аб тым, каб перыядычны друк садзейнічаў найбольш поўнаму задавальненню духоўных патрэб чалавека, выхаванню савецкіх людзей у духу любві да сваёй сацыялістычнай Радзімы і адданасці ідэалам камунізма.

Больш 11 мільёнаў газет і часопісаў распаўсюджваецца ў гэтым годзе ў нашай рэспубліцы. На 1 000 жыхароў Беларусі прыпадае 1 250 экземпляраў перыядычных выданняў. Гэта яскравае сведчанне сілы друкаванага слова, яго папулярнасці, росквіту культуры нашага народа.

Зараз у рэспубліцы пачалася падпісная кампанія на 1970 год. Гэты год асаблівы. Савецкія людзі рыхтуюцца адзначыць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна новымі працоўнымі поспехамі на ўсіх участках камуністычнага будаўніцтва. Адным з важнейшых участкаў з'яўляецца наша сацыялістычная культура.

Ленінская нацыянальная палітыка дала магчымасць кожнаму народу нашай краіны развіваць сваю нацыянальную культуру. Сёння ўсяму свету ясна відны поспехі і дасягненні ў будаўніцтве шматнацыянальнай сацыялістычнай культуры. Беларуская культура, літаратура і мастацтва, нацыянальныя па форме і сацыялістычныя па змесце, за гады Савецкай улады выйшлі далёка за межы рэспублікі, іх лепшыя здабыткі багатым струменем уліваюцца ў агульную плынь сацыялістычнай культуры. На Поўначы і Далёкім Усходзе, у Сярэдняй Азіі за межамі нашай краіны можна цяпер сустрэць кнігі беларускіх пісьменнікаў у перакладах на іншыя мовы.

Шырока вядомы таксама і нашы беларускія літаратурныя выданні, часопісы і газеты, якія аддаюць свае старонкі лепшым творам беларускіх пісьменнікаў, знаёмяць чытачоў з працоўным і культурным жыццём Беларусі, трымаюць сувязь з літаратурнымі выданнямі і творчымі саюзамі іншых братніх рэспублік, друкуюць у перакладах на беларускую мову лепшыя творы замежных пісьменнікаў.

Беларускія літаратурныя выданні — часопісы «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», «Неман», газета «Літаратура і мастацтва» і іншыя — рыхтуючыся да Ленінскага юбілею, пазнаёмяць чытачоў у новым годзе з лепшымі творамі беларускіх пісьменнікаў: раманамі і аповесцямі, п'есамі, паэмамі і вершамі, нарысамі і артыкуламі, у якіх знойдзе шырокае адлюстраванне ленінская тэматыка. Шмат якія пісьменнікі пабывалі сёлета ў мясцінах, звязаных з імем Ільіча, і зараз працуюць над творамі, якія маюць быць цікавымі і хвалюючымі.

Органы культуры, народнай асветы, прафсаюзныя арганізацыі, органы сувязі, якія арганізоўваюць і праводзяць падпіску, павінны паклапаціцца аб тым, каб беларускія літаратурныя выданні былі ў кожнай бібліятэцы і школе, у клубе і навучальнай установе.

Плённа вялася і вядзецца такая работа ў Светлагорскім, Слаўгарадскім і Берастовіцкім раёнах. Тут загадзя клапоцяцца пра тое, каб своечасова стварыць пункты па падпісцы, забяспечыць іх каталогамі і плакатамі, падрыхтаваць неабходную колькасць грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку, дамагчыся высокага ўзроўню і стабільнасці падпіскі на беларускія літаратурныя выданні.

Зараз праходзіць усесаюзны агляд бібліятэк, пераклічка сельскіх клубаў, усесаюзны агляд паркаў і музеяў. Калектывы мастацкай самадзейнасці таксама ўдзельнічаюць у аглядзе, прысвечаным Ленінскаму юбілею. Многія калектывы, якія пастаянна сочаць за беларускімі літаратурнымі выданнямі, склалі рэпертуар з улікам лепшых дасягненняў роднай літаратуры. мастацтва, напоўнілі яго лепшымі здабыткамі народнай творчасці. Аднак шмат якія калектывы маюць яшчэ бедны рэпертуар: творы, прынятыя імі да выканання, часам не вызначаюцца арыгінальнасцю, маюць нізкі мастацкі ўзровень. Органы культуры павінны зрабіць усё, каб своечасова забяспечыць іх беларускімі перыядычнымі выданнямі, дзе пастаянна змяшчаюцца творы ў дапамогу самадзейным калектывам і выканаўцам, артыкулы спецыялістаў, у якіх яны разглядаюць і аналізуюць творчасць аматараў мастацкай самадзейнасці.

Важныя задачы ў гэтым годзе па падпісцы на беларускія літаратурныя выданні пастаўлены і перад органамі народнай асветы, перад усімі, хто працуе ў навучальных установах і школах. Вядома, што выкладанне роднай літаратуры ў асобных школах абмяжоўваецца толькі хрэстаматыйнымі творамі, вядзецца адасоблена ад сучаснага літаратурнага працэсу. Пазбавіцца гэтых хібаў можна толькі тады, калі і настаўнікі, і вучні будуць пільна сачыць за літаратурнымі творамі, што з'яўляюцца на старонках беларускіх выданняў, дзяліцца аб іх сваімі ўражаннямі. Гэта спрыяе развіццю мастацкага густу вучняў, узбагачае іх чароўнай сілай мастацкага слова, садзейнічае іх камуністычнаму выхаванню.

Органам сувязі, якія арганізоўваюць падпіску, неабходна наладзіць цесныя кантакты з бюро прапаганды мастацкай літаратуры пры Саюзе пісьменнікаў БССР, рэдакцыямі часопісаў і газет, каб сумесна — на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, клубах, бібліятэках і школах — арганізаваць канферэнцыі чытачоў з удзелам пісьменнікаў, грунтоўна падрыхтаваць грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку да правядзення падпіснай кампаніі.

Трэба зрабіць усё, каб у год Ленінскага юбілею значна ўзраслі тыражы беларускіх літаратурных выданняў, каб беларускае мастацкае слова, шырокую дарогу якому ў свет адкрыла ленінская нацыянальная палітыка, даходзіла да сэрца кожнага чалавека, будзіла ў ім вялікія пачуцці любві да сваёй Радзімы, да свайго народа.



Зараз яны пачуюць першае слова першай настаўніцы.

У ШЧАСЛІВУЮ ДАРОГУ!

Вось і стала людна ў аўдыторыях. Пачаўся новы навучальны год. Для тысяч і тысяч юнакоў і дзяўчат, што ўпершыню занялі месцы ў аўдыторыях і класах навучальных устаноў, настае хвалюючая пара знаёмства з будучай прафесіяй, для многіх — сёлетні год апошняя прыступка перад дарогай у вялікае самастойнае жыццё.

Карэспандэнты «Літаратуры і мастацтва» папрасілі кіраўнікоў некаторых вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў расказаць, які ён будзе, новы навучальны год, падзяліцца сваімі планамі, клопатамі.

У. БЕЛЫ, рэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

Універсітэт наш — самая маладая вышэйшая навучальная ўстанова рэспублікі — ёй усяго некалькі месяцаў. Створана яна на базе Гомельскага педінстытута імя Чкалава.

Сёлета на першыя курсы прынята 1050 студэнтаў. Праз пяць гадоў гэта будуць выкладчыкі рускай і беларускай моў і літаратуры, спецыялісты па фізіцы, матэматыцы, біялогіі, гісторыі, гідралогіі і інжынернай геалогіі, па арганізацыі механічнай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі, эканоміцы працы.

Чатыры апошнія спецыяльнасці — новыя. Наогул жа універсітэт будзе развівацца і расці ў адпаведнасці з развіццём прамыслова-эканамічнага патэнцыялу Палесся. Зразумела, у будучым з'явяцца новыя факультэты. Скажам, такія, як нафтавы.

Хочацца адзначыць такую дэталь: калі ў 1930 годзе — годзе заснавання Гомельскага педінстытута — на яго двух факультэтах займалася ўсяго 100 студэнтаў, дык ва універсітэце зараз толькі на дзённым аддзяленні каля 7 тысяч чалавек.

Універсітэт мае добрыя навуковыя і педагагічныя кадры. Назаву хаця б такіх выдатных вучоных, як акадэмік, доктар фізіка-матэматычных навук, загадчык кафедры алгебры Сяргей Антонавіч Чуніхін, доктар сельскагаспадарчых навук, дэкан біёлага-глебавага факультэта прафесар Фёдар Мікалаевіч Харытановіч, доктар філалагічных навук, загадчык кафедры літаратуры, член Саюза пісьменнікаў БССР Павел Паўлавіч Ахрыменка і інш.

Якім я бачу будучае нашага універсітэта? Для універсітэцкага гарадка ўжо адведзена 80 гектараў у цэнтры горада. Неўзабаве тут вырастуць шматпавярховыя вучэбна-лабараторныя карпусы, карпусы навукова-даследчых інстытутаў, вылічальны цэнтр, батанічны сад, музей прыроды Палесся, бібліятэка, выдавецтва, спартыўны комплекс, 14-павярховы галоўны вучэбны корпус.

Цудоўным абяцае быць і студэнцкі гарадок. Інтэрнаты — самыя сучасныя, кватэрнага тыпу, з усімі камунальнымі выгодамі.

Чытачам «Літаратуры і мастацтва», відаць, цікава даведацца пра наш уклад у культурнае жыццё рэспублікі. З даўніх часоў пры педінстытуце, а зараз пры універсітэце, працуе самае буйнае на Палессі літаратурнае аб'яднанне. Цікава адзначыць, што ў свой час праз яго прайшлі Мікола Сурначоў і Леанід Гаўрылаў, якія не вярнуліся з вайны, Іван Шамякін, Кастусь Кірэенка, Паўлюк Пранузa, Міхась Даніленка і іншыя літаратары. Многія цяперашнія члены літаб'яднання паспяхова выступаюць у абласным і рэспубліканскім друку. Сярод іх Ніна Шклярава, Таіса Цыганкова, Люба Прышчэпава, Віктар Яраш, Мікола Хамячкоў, Рыгор Андрыявец.

Сёння нашы студэнты атрымалі цудоўны падарунак — выйшаў першы нумар шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт».

А. КАЛЮЖНЫ, загадчык вучэбнай часткі Мінскага мастацкага вучылішча імя А. К. Глебава.

Для нас, педагогаў Мінскага мастацкага вучылішча імя А. К. Глебава, да агульнага святочнага настрою прымешваецца і трывога. Мяркуйце самі: у гэтым годзе на першы курс нашага вучылішча паступіла дзевяноста восем чалавек, на трыццаць больш чым звычайна — гэта радасна, але дзе мы іх будзем вучыць? Сёння нашы 19 груп займаюцца ў дзве, тры, а то і чатыры змены, бо майстэрань не хапае, ды і раскіданы яны па розных канцах горада.

Але мы спадзяёмся на лепшае, радуемся, што папулярнасць нашага вучылішча расце.

А. ДАВЫДАЎ, дырэктар Мінскага кааператыўнага тэхнікума.

У 1967 годзе ў нас адкрылася новае аддзяленне па спецыяльнасці «таваразнаўства кнігі». Больш 60 нашых выпускнікоў працуюць зараз у спажывецкай кааперацыі таваразнаўцамі па кнізе.

Сёлета на гэтым аддзяленні быў большы конкурс, чым летась. Прынялі 30 чалавек. Гэта ў асноўным сельская моладзь. У новым навучальным годзе адкрываем кабінет таваразнаўства кнігі. У кабінеце будзе літаратура па ўсіх галінах ведаў, а таксама некалькі ўзораў абсталявання кнігарань — з паліцамі, столікамі, вітрынамі, стэндамі і г. д. Словам, як у сапраўдным магазіне.

У. ІЛЬЮШАНКА, дырэктар Мінскага гарадскога прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча кінамеханікаў.

Сёлетні навучальны год у нас юбілейны, дваццаць пяты. За чвэрць веку вучылішча падрыхтавала цэлую армію кваліфікаваных спецыялістаў.

Вельмі паважаюць свайго кінамеханіка, нашага былога выпускніка, Станіслава Аляксандравіча Адамовіча ў вёсцы Ратамка Мінскага раёна. Дваццаць гадоў назад ён скончыў наша вучылішча і з таго часу плённа працуе ў кінапракаце. Адамовіч сапраўдны майстар сваёй справы, ударнік камуністычнай працы, дэпутат сельскага Савета. На днях, у сувязі з 50-годдзем савецкага кіно, Станіслаў Аляксандравіч быў узнагароджаны значком «Выдатнік кінематаграфіі». Такіх прыкладаў можна прывесці шмат.

Радуе, што з кожным годам да нас ідзе ўсё больш і больш моладзі. Сёлета, напрыклад, прынялі каля трохсот чалавек. Прыемны падарунак навучэнцам — новая лабараторыя кінаапаратуры. Неўзабаве справім наваселле ў новым інтэрнаце.

В. ЛАПІЦКІ, дырэктар Мазырскага музычнага вучылішча.

У культурным жыцці Мазыра адбылася значная падзея — адкрылася новае музычнае вучылішча. З глыбінных раёнаў Палесся — Жыткавіч, Ельска, Нароўлі, Петрыкава і Турава паступіла 256 заяў. Найбольшы конкурс быў па класе фартэпіяна і баяна. На жаль, не было ў нас абітурыентаў па класе тэорыі музыкі. Гэтыя 12 месц давялося па-брацку падзяліць паміж класамі харавога дырыжыравання, народных і струнных інструментаў. І вось прынята 75 чалавек на дзённае і 25 — на завочнае аддзяленні.

З першага ж дня студэнтаў «узялі ў рукі» педагогі. У нас 15 педагогаў, усе з вышэйшай спецыяльнай адукацыяй. Дзесяць з іх — выпускнікі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

Справа новая, так што турбот і клопатаў хапае. Набылі ўжо шэсць фартэпіяна, раяль. Цяпер патрэбны баяны, скрыпкі, цымбалы і іншыя інструменты.

В. ВІНАГРАДАЎ, прарэктар па вучэбнай і навуковай рабоце Віцебскага дзяржаўнага педінстытута імя С. Кірава.

Учора пяцьдзесят юнакоў і дзяўчат упершыню пераступілі парог нашага мастацка-графічнага факультэта. Гэта будучыя выкладчыкі малявання і чарчэння ў сярэдніх школах. А пакуль што наперадзе ў іх пяць гадоў напружанай вучобы.

Творчыя камандзіроўкі, выезды на «натуру», удзел у мастацкіх выстаўках, сустрэчы з майстрамі пэндзля і разца — вось тая творчая атмасфера, у якой праходзяць будні факультэта.

Дарэчы, сёлета ён уступае ў сваё другое дзесяцігоддзе. Факультэт ужо выпусціў каля чатырохсот чалавек. З іх 69 сёлета.

Ф. ВРАНКО, дырэктар Гродзенскага культасветвучылішча.

Пачынаем новы навучальны год з радасцю — будуецца вучэбны корпус! Гэта будзе сучасны чатырохпавярховы будынак з канцэртнай залай на 600 месц. Будуць класы для заняткаў музыкай, танцавальны клас, чытальня з бібліятэкай...

На першы курс мы сёлета прынялі 120 чалавек. Паступіла да нас пераважна сельская моладзь. Многія закончылі музычныя школы.

У трох групах (танцавальнае і харавое аддзяленні) другога курса навучальны год пачаўся вытворчай практыкай. Нашы выхаванцы паехалі працаваць у культасветустановы Берастовіцкага, Ваўкавыскага, Навагрудскага раёнаў.

Толькі што вярнулася з паездкі наша агітбрыгада. У час летніх канікулаў яна выступала ў калгасах і саўгасах вобласці перад студэнцкімі будаўнічымі брыгадамі. Больш ста канцэртаў далі энтузіясты самадзейнага мастацтва за лета.

КРЫШТАЛЬ, ФАРФОР І ШКЛО

Калі Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў рэспублікі абвясціла закрыты конкурс на лепшы юбілейны выраб у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, многія задумаліся. І было над чым. Ленінская тэма — адна з самых багатых і невычэрпных. Яна заўсёды хвалявала і хвалюе мастакоў, скульптараў, майстроў прыкладнога мастацтва. Вырашыць яе ў шкле, фарфоры і крышталі — гэта і было мэтай конкурсу.

У сістэме прамбудматэрыялаў толькі тры прадпрыемствы выпускаюць мастацкую прадукцыю. Гэта шклозаводы «Нёман», імя Дзяржынскага і Мінскі фарфоравы завод. Мастакі і майстры-ўмельцы гэтых прадпрыемстваў і былі галоўнымі прэтэндэнтамі на прызавыя месцы ў конкурсе. Яны прыслалі на конкурс 39 вырабаў са шкла, крышталю і фарфору. Сярод іх чайна-кафейныя сервізы і гарнітуры, дэкаратыўныя вазы і талеркі, медальёны, падарункавыя келіхі і фужэры, розныя дэкаратыўныя наборы з крышталю, шкла, фарфору.

І вось днямі журы падвяло вынікі. Другая прэмія (першай ніхто з удзельнікаў конкурсу не атрымаў) прысуджана мастачцы шклозавода «Нёман» С. Раудвэе за дэкаратыўную юбілейную вазу «Прамень». Гэта ваза з жоўта-залацістага крышталю вышынёй 40 сантыметраў. У цэнтры яе — партрэт Ільіча, а ва ўсе бакі ад яго разыходзяцца крыштальныя ззяючыя промні.

Такой жа прэміі ўдастоена і ваза гэтага завода «Зарыва» (аўтар — В. Дзівінская). Яна з празрыста-чырвонага крышталю, строгіх, прамых форм, такой жа вышыні, як і першая. У цэнтры яе пескаструменным спосабам нанесены сілуэт У. І. Леніна і даты «1870—1970».

Трэцяя прэмія прысуджана прадстаўніку Барысаўскага шклозавода імя Дзяржынскага маладому мастаку П. Арцём'еву за крыштальную дэкаратыўную талерку «ГОЭЛРО». Алмазнымі гранямі на знешнім баку аўтар сімвалічна паказаў увасабленне ленінскай мары аб электрыфікацыі краіны.

Арыгінальны таксама чайна-кафейны сервіз галоўнага мастака Мінскага фарфоравага завода В. Леантовіча. У гэтым наборы 34 прадметы, і ўсе яны вабяць вока сваёй незвычайнай бутонападобнай формай, тонкім дэкаратыўным роспісам, які нагадвае славутыя слуцкія паясы. У арнамент уплецены словы «Ленін» і «100 год». Аўтар гэтага прыгожага сервіза таксама атрымаў трэцюю прэмію.

Заахвочвальную прэмію за дэкаратыўную талерку «Юбілей» атрымаў мастак гэтага завода А. Фядусь. Ён у фарбах адлюстраваў вобраз правадыра на фоне тэхнікі і чырвонага палотнішча. Заахвочвальныя прэміі прысуджаны і тром юбілейным вазам з крышталю — «Трыбуна», «Звязда» і «Юбілей» (аўтары — Л. Мягкова і У. Жахаў).

Многія вырабы, якія не атрымалі прызоў, рашэннем мастацкага савета Міністэрства будматэрыялаў будуць рэкамендаваны ў вытворчасць.

Тут трэба адзначыць арыгінальны чайна-кафейны гарнітур выпускніцы Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута А. Літвіненкі. Усе прадметы з гарнітура строгай цыліндрычнай формы з мяккім дэкаратыўным роспісам. Фарфор добра спалучаецца з точанымі драўлянымі вечкамі на кафейніку, чайніку, малочніцы, цукарніцы і падшкляннікамі.

Цікавыя па думцы і выкананні падарункавыя дэкаратыўныя фужэры і келіхі паўлічаных форм. З вітымі ножкамі, рознымі па форме чашамі са шкла і крышталю, яны падабаюцца ўсім. Аўтар гэтых вырабаў — барысаўчанін У. Пракоф'еў.

Сярод іншых работ вылучаюцца дзве падарункавыя дэкаратыўныя талеркі нёманскага майстра А. Федаркова. Адна з іх з чырвонага шкла з крэалітавай кветкай пасярэдзіне. Другая — з цёмна-сіняга шкла з крэалітавымі спіральнымі разводамі.

На конкурс былі прадстаўлены шматлікія мастацкія сувеніры малых форм з фарфору — вазачкі, разеткі, кветніцы і іншыя вырабы. Яны розныя па задуме і выкананні. Многія з іх знойдуць дарогу да пакупнікоў.

Несумненна, юбілейны конкурс значна выйграў бы, калі б мастацкі савет Міністэрства будматэрыялаў БССР меў больш цесныя кантакты са сваімі суседзямі з Прыбалтыкі, Расійскай Федэрацыі, Украіны. Удзел у такіх конкурсах аднатыпных прадпрыемстваў з суседніх рэспублік пайшоў бы толькі на карысць.

І. СУЧКОЎ.

ТЫМ, ХТО ДРУЖЫЦЬ З ПЕСНЯЙ

На пісьмовых сталах Мінскага абласнога Дома народнай творчасці раскладзены пакункі. У кожным — невялічкія брашуры і нотныя лісты. Дваццаці шасці адрасатам — метадычным кабінетам раённых і гарадскіх дамоў культуры рассылаецца рэпертуар для хораў, салістаў-вакалістаў, а таксама танцавальным калектывам, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Мастацкі савет абласнога Дома народнай творчасці рэкамендуе самадзейным калектывам сем новых песень кампазітараў-аматараў Міншчыны. Сярод іх — «Імя Леніна» І. Трoскі на словы М. Святлова, «Песня аб Леніне» В. Жукоўскага ў апрацоўцы І. Лучанка на словы А. Харкевіча і інш.

Дасылаецца таксама рэкамендацыйны спіс рэпертуару для харавых і вакальных калектываў мастацкай самадзейнасці, складзены заслужаным дзеячом мастацтва БССР М. Маславым. Кіраўнікі хораў знойдуць тут усё патрэбнае для святочных канцэртных праграм, прысвечаных ленінскаму юбілею. Асобна выдзелены любімыя песні Ільіча, творы для аднародных (мужчынскіх і жаночых), змешаных з суправаджэннем і без суправаджэння і народных хораў. Хормайстар знойдзе песні для дзіцячага хору, творы для салістаў.

Рэспубліканскі Дом народнай творчасці падрыхтаваў «Рэкамендацыйны спіс запісаў танцавальных твораў для мастацкай самадзейнасці» складзены С. Грабеншчыкавым. Ён дапаможа самадзейным калектывам папоўніць праграмы святочных канцэртаў.

Багаты раздзел «Беларускія танцы». Рэкамендуюцца да выканання звыш 30 танцаў. Сярод іх, акрамя шырока вядомых «Крыжачка», «Лявоніхі», «Бульбы», Юрачкі» — «Чарот» і «Полька» ў пастаноўцы і запісе А. Рыбальчанкі, «Смаргонская кадрыля» (сцэнічная апрацоўка і запіс Я. Хацялоўскага), дзявочы карагод «Рэчыцкая лірычная», «Жураўы» (пастаноўка і запіс А. Грабеншчыкава), «Малацілачка» (сцэнічная апрацоўка і запіс І. Серыкава), «Гняваш» (пастаноўка І. Астравумава, запіс Г. Касцюкова), «Козачка» (пастаноўка Я. Хвораста, запіс К. Алінай) і рад іншых.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ВЫКЛАДЧЫКАЎ МУЗЫЧНЫХ ШКОЛ

Два дні ў Мінску працавала жнівеньская метадычная канферэнцыя выкладчыкаў музычных школ. На пленарным пасяджэнні з дакладам «Задачы педкалектываў музычных школ горада па паляпшэнні вучэбна-выхаваўчай работы ў новым навучальным годзе» выступіў начальнік Упраўлення культуры Мінскага гарвыканкома М. Жукоўскі. Паведамленне аб выніках уступных экзаменаў у Мінскае музычнае вучылішча імя Глінкі зрабіў яго дырэктар А. Каландзёнак. Цікавым быў даклад старшага выкладчыка Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Т. Шчарбаковай «Ленін і мастацтва».

Другі дзень канферэнцыі быў прысвечаны рабоце секцый: фартэпіяннай, струнных, смычковых і духавых інструментаў, баяна, харавой і тэарэтычных дысцыплін. На пасяджэнні харавой секцыі з дакладам «Развіццё слыху і пеўчых навыкаў вучняў у дзіцячым харавым калектыве» выступіў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР М. Маслаў. Загадчык тэарэтычнага аддзела Мінскага музычнага вучылішча В. Сізко зрабіла даклад на секцыі тэарэтычных дысцыплін на тэму: «Новыя творы беларускіх кампазітараў».

ПАКАЗВАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ


У нашай рэспубліцы сотні аматараў кіна-фотамастацтва. Большасць з іх аб'яднана ў клубы, гурткі і студыі пры прафсаюзных дамах і палацах культуры. Такія аб'яднанні дзейнічаюць у Гомелі, Віцебску, Гродна, Брэсце, Баранавічах, Маладзечна і ў іншых гарадах. Яны наладжваюць конкурсы, абсталёўваюць фотавокны і фотавітрыны.

Зараз фотааматары заняты падрыхтоўкай да слаўнага ленінскага юбілею. Плённа працуюць члены аматарскага клуба «Мінск» пры Доме мастацкай самадзейнасці абласнога савета прафсаюзаў.

Днямі на адным з будынкаў вуліцы Казлова з'явіўся вялікі шчыт са словамі: «Паказвае фотаклуб «Мінск». На гэтай агульнадаступнай выстаўцы прадстаўлена больш дваццаці работ аматараў. Яны розныя па тэматыцы і змесце, але ўсіх іх аб'ядноўвае адно — добрае выканаўчае майстэрства.

Прыцягваюць увагу сваёй непасрэднасцю і жыццёвай прастатой работы С. Рута — партрэты старога рабочага, дзяўчынкі ў хустцы і эцюднае фота «Каруселя».

Х. Грыгор'еў паказвае серыю тэматычных здымкаў пад назвай «Хатынь» С. Яўкін дэманструе здымкі «Курган славы», «Ля помніка Перамогі», «Ідуць ветэраны». А другі фотааматар — Р. Шкляр захапляецца дзіцячай тэматыкай. Ён прадстаўлены жанравымі здымкамі «Дзеці», «Утульны куток», «Разгубіўся».



Не паспелі камбайнеры калгаса «Сцяг камунізма» Пухавіцкага раёна спыніць свае агрэгаты, як каля іх з'явіліся ўдзельнікі агітбрыгады Турынскага сельскага клуба. У абедзенны перапынак механізатары паглядзелі канцэрт у полі.

На здымку: справа налева — загадчык сельскім клубам Віктар Землянікін, мастацкі кіраўнік Валянціна Сікор, загадчык фельчарска-акушэрскім пунктам Ала Касцюк і лабарантка Раіса Міхейчык выступаюць у канцэрце.

Фота А. ЯРОХІНА і Г. ПАРТНОВА.

ЗАЎТРА—АДКРЫЦЦЁ НОВАГА ТЭАТРАЛЬНАГА...

Чвэрць стагоддзя жыве на сцэне Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Паўлінка». Гэтым спектаклем, які адкрывае афішу, калектыў адкрывае і сёлетні сезон. Хоць тысячы мінчан добра ведаюць усе тыя прыгоды ў хаце Крыніцкіх, хоць некаторыя рэплікі ўжо сталі крылатымі і ўвайшлі ў прымаўкі, твор народнага паэта Беларусі Я. Купалы кожны раз прыцягвае ўвагу шматлікіх прыхільнікаў тэатра.

Заўтра, а палове восьмай, адкрыецца заслона, і зноў, як гэта было дваццаць пяць гадоў назад у далёкім Томску, адбудзецца прэм'ера. Так, прэм'ера, бо «Паўлінку» тэатр захоўвае ў рэпертуары як «самы любімы» і дарагі спектакль. І іграецца ён заўсёды з хваляваннем і натхненнем нібы ўпершыню.

Фота А. ЛУКАШОВА.

ПРАВАФЛАНГОВЫЯ...

Уладзімір ДЗЯДЗЮШКА, народны артыст БССР

Знамянальная дата ў гісторыі савецкага тэатра для нас, беларускіх артыстаў, дарагая ўдвая, бо ўсяго толькі праз год пасля таго, як Уладзімір Ільіч Ленін падпісаў дэкрэт аб аб'яднанні тэатральнай справы, у верасні 1920 года адкрыўся першы прафесіянальны беларускі тэатр—цяпер тэатр імя Янкі Купалы.

Стварэнне трупы Першага БДТ было паваротным этапам у жыцці нацыянальнага беларускага сцэнічнага мастацтва. Згуртаваўшы вакол сябе драматургаў, рэжысёраў, артыстаў, музыкантаў і мастакоў, гэты тэатр амаль з першых крокаў заваяваў прызнанне як калектыў творчых аднадумцаў, дэвізам якога стала служэнне народу і самым перадавым ідэалам часу—камуністычным.

Мабыць, газеты не хопіць, каб пералічыць толькі імёны і факты бурнага тэатральнага жыцця на Беларусі за гэтыя паўстагоддзя. Расказваць пра гэта можна бясконца... Для мяне асабліва дарагія тыя спектаклі, якія пакідалі незабыўны след у сэрцах гледачоў, абуджалі высокія пачуцці, роздум пра дабро і зло, светлыя мары. Гэта дасягалася не толькі нашым жаданнем іграць як мага лепш, каб захапляць залу, а і нашым агульным імкненнем, каб на сцэне быў сапраўды на высокім прафесіянальным узроўні беларускі твор. Цяпер, мне здаецца, нават немагчыма правесці мяжу паміж намерамі беларускага акцёра і яго творчасцю, бо ён заўсёды адчуваў свой грамадзянскі і мастацкі абавязак і аддаваў усе сілы душы, майстэрства і натхненне. Успамінаю непаўторную таленавітасць У. Крыловіча і К. Міронаву, В. Галіну і Б. Платонава, У. Уладамірскага і Л. Ржэцкую, І. Ждановіч і Г. Глебава... Якога ўзроўню майстэрства дасягнуў беларускі артыст!

Чатырнаццаць гадоў я працаваў у былым Трэцім БДТ. У трупе Уладзіслава Галубка. Пешшу і конна, на машынах і санях мы вандравалі па ўсёй Беларусі. Трохі ўрачыста гэта называлася тады—несці культуру ў масы. Не ўсё, вядома, было ў нас бездакорным—і пачыналі мы з п'ес наіўнаватых, і грэлі, бывала, празмерна нацыянальныя рысы героя. Але, паклаўшы руку на сэрца, магу сказаць, што мы не дазвалялі сабе палёгкі і прымалі іншы раз не вельмі прыемную крытыку, гаворачы адзін аднаму шчырую праўду без «падыходаў» і скідак. Справа, якую мы рабілі, была агульнай справай нашага калектыву і ўдацца магла толькі гуртам, разам і толькі ў атмасферы шчырасці і давер'я.

У 1937 годзе я стаў артыстам Першага БДТ, і цяпер лічу сябе адданым купалаўцам. Хоць і запалі глыбока ў сэрца гады вандроўнага акцёрскага юнацтва, штосьці надзвычай важнае ў маім творчым лёсе звязана з акадэмічнай сцэнай. Часам думаю—а што ж было галоўным? Відаць, сустрэча з вобразамі нацыянальнай драматургіі: у Трэцім БДТ—у п'есах У. Галубка, Е. Міровіча і Д. Курдзіна, у купалаўскім—у п'есах Я. Купалы, К. Крапівы, А. Макаёнка, А. Маўзона. З гэтых крыніц нам больш зручна чэрпаць матэрыял для стварэння характараў з народа, перадаваць свой роздум аб тым жыцці, якое ведаеш і любіш больш за ўсё на свеце, раскрываць нешта прызапашанае асабістым вопытам. Не, пра нацыянальную абмежаванасць не можа быць і гаворкі. Напрыклад, сыграўшы ў трыццатыя гады Гая ў «Маім другу» М. Пагодзіна, я адчуваў, што гэта—мой герой, чалавек маіх інтарэсаў і майго пакалення. Мне радасна, што на нашай афішы ёсць Шэкспір і Астроўскі, Талстой і Горкі, Мальер і Фрэдра, што навінкі сучаснай драматургіі не абмінаюць нас.

Некалькі апошніх сезонаў мы іграем быццам так, як і раней — здараецца нават з поспехам, ставім маштабныя п'есы. Але нешта трывожыць. І, здаецца, не мяне аднаго. Я спрабую разабрацца і разумею, што адным словам гэтага неспакою не выкажаш.

Гэта, відаць, і слізганне па паверхні, калі мы задавальняемся дробнай тэматыкай, нізкім мастацкім узроўнем драматургічнага твора: так адной ці мы дазволілі сабе паставіць «Мільён за ўсмешку», адрозніваючыся магічнай гаварыць «не» вельмі не нашай п'есе, ды неабходна. Я назваў «Мільён за ўсмешку», але можна было б назваць яшчэ шэраг п'ес. Так, летась адбылася прэм'ера па п'есе «Дзесяць сутак за каханне». Можа і такі твор мае права на жыццё, але нас, калі б мы былі больш патрабавальнымі, ён павінен быў бы выклікаць.

На жаль, мы губляем рысы непаўторнага арыгінальнага мастацкай трупы. Можа, таму, што галоўныя рэжысёры ў нас змяняюцца вельмі часта. І гадамі мы працуем наогул без адзінага мастацкага кіраўніцтва. Кожны з нас павінен клапаціцца пра змену, пра артыстычную моладзь. Павінны, але клапоцімся пакуль што мала. Не ведаю, як каму, а мне (ды і не толькі мне, зрэшты, у тэатры аб гэтым часам пагаворваюць) крыўдна назіраць, як нівеліруецца наша трупа. Хай сабе сёння гэта заўважаюць толькі мы, старыя акцёры, усё роўна трэба рашуча прымаць захады, каб тэатр не страціў сваё творчае аблічча. У мастацтве ж звычайна так бывае—калі своечасова не ліквідаваць прычыну застою і абыякавасці, заўтра будзе позна: штосьці ўжо ніколі не адновіш...

Чаму я загаварыў пра тое, што набалела, цяпер, напярэдадні новага сезона? Ды так ужо нас выхавалі — знамянальны дзень ці выстаўку ўзнагароды прымушаюць нас ацэньваць зробленае па высокіх мерках і думаць аб заўтрашнім дні. Ленінскія прынцыпы ў мастацтве абавязваюць кожнага работніка тэатральнага фронту па-грамадзянску прынцыпова ўзважваць дасягнутае, не заплюшчваць вочы на недахопы, змагацца з імі, выпраўляць.

Канечне, у творчым жыцці здараецца рознае. Толькі прыкрывацца гэтым не варта. Трэба адрозніваць натуральныя выдаткі творчых пошукаў ад правінцыялізму. Правінцыялізмам я лічу той бескантрольны паток спектакляў, пазбаўленых арыгінальнай думкі і мэтазгоднай сцэнічнай формы, калі не адбываецца свята — свята драматургіі і тэатра.

У вітрынах мінскіх магазінаў я сустракаю фатаграфіі макета будучага цэнтра горада, на якіх бачу і, мабыць, будынак тэатра імя Янкі Купалы. Шчыра скажу, што хоць і вельмі люблю наш стары будынак у засені дрэў на скверы з помнікам роднаму песняру, не пярэчу, каб была ў нас хаціна больш сучасная і па знешнім выглядзе і па абсталяванні. А вось знойдзенае, завазванае, у творчых набытках ансамблевае мастацтва купалаўскай трупы штучнай мадэрнізацыі пад нейкі сярэдне-сучасны стандарт аддаваць не хочацца. Толькі хай не лічаць мяне рэтраградам, не наракаюць, што я супраць пошуку, супраць руху наперад — гэта неабходна, як дрэву паветра, як вада рыбе. Але я за такі пошук, які б дапамагаў нам, купалаўцам, узнімацца ўсё вышэй і вышэй і заставацца купалаўцамі.

Вось якія думкі з'явіліся ў мяне, калі я пачаў перабіраць у памяці святы і будні свайго роднага тэатра. Веру, што мы яшчэ здолеем паказаць сапраўдны ўзровень беларускай сцэнічнай культуры і сустрэнем наступныя даты гісторыі тэатра вартымі свайго часу.

Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы бывае называюць правафланговым беларускага савецкага сцэнічнага мастацтва—гэта абавязвае! Сілы ў нас хапае — старая гвардыя ў баявым настроі, моладзь таленавітая. Таму я з надзеяй і ўпэўненасцю гляджу ў заўтрашні дзень роднага тэатра.

МАРАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ— ГАЛОЎНАЯ ТЭМА

Новыя п'есы ёсць заўсёды, але бываюць перыяды, калі п'есы набываюць асаблівае значэнне, бо робяцца характарыстыкамі і эстэтычных, і сацыяльных прыкмет часу. Такім эмацыянальна напружаным і цэласным выглядаў тэатральны рэпертуар, падрыхтаваны да пяцідзесяцігоддзя Савецкай улады. Цяпер зноў мы бачым творчы ўздым сярод мастакоў, якія рыхтуюцца да гістарычнай даты — 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Ці ўсе п'есы павінны расказваць аб справах і жыцці правадыра? Пры ўсёй важнасці стварэння вобраза Леніна, характараў яго паплечнікаў, мастацкага адлюстравання вялікай бітвы партыі за новы камуністычны свет, пісьменнікі звузілі б сваю задачу, калі б прайшлі міма сучаснасці, не звярнуліся б да характараў ленінцаў, да подзвігаў працы і духу людзей сённяшняга дня.

У гэтым аглядзе хацелася б расказаць аб тых новых п'есах, якія, адлюстроўваючы сённяшнія справы, прасякнуты і адчуваннем усяго шляху, пройдзенага народам, адчуваннем гістарызму і высокай грамадзянскасці.

Новымі гранямі раскрываецца ленінскі характар у некаторых п'есах, напісаных за апошні час, і толькі зараз яны прыходзяць у тэатр.

Закончана вялікая драматычная эпапея вядомай пісьменніцы Марыі Прыляжаевай — «Дзівосны год». П'еса гэта ўваскрашае цяжкія дні ленінскай ссылкі, але не як побыт, не як звычайны дзённік, а як велізарны этап збірання сіл, як перыяд магутнага ўплыву Леніна на палітычных ссыльных, якія побач з правадыром яшчэ больш мужна, актыўна праяўлялі свой характар.

У драматургію зараз прыйшлі многія літаратары братніх рэспублік, прыйшлі маладыя імёны, са сваім свежым поглядам на свет.

Аб Брэсцкім міры напісаў п'есу беларускі драматург К. Губарэвіч. У яго п'есе Ленін сустракаецца з салдатамі, рабочымі, паказаны ў сутыкненні з рэальным жыццём, якое падказвае яму рашэнні, раскрываюцца ўзаемаадносіны правадыра з дзеячамі партыі.

З цікавай п'есай «Хвалі б'юць аб бераг» выступае і малады чувашскі драматург Н. Цярэнцьеў. У яго драме, прысвечанай сям'і Ульянавых, свежа гучыць тэма братняй салідарнасці народаў. Малады Валодзя Ульянаў і яго адносіны з чувашскай інтэлігенцыяй, якая толькі нараджаецца, — новая праблематыка гэтай п'есы.

Толькі што закончана трагедыя «Прыгавор» маладога кіргізскага драматурга Бексультана Жакіева. П'еса гэта ў рэдкім для савецкай драмы жанры — трагедыі, узнімае складаныя жыццёвыя супярэчнасці, выяўляе і сутыкае розныя характары. Вялікая Айчынная вайна. Далёкая Кіргізія. Але фронт і тут — вастрэйшы, маральны, інтэлектуальны фронт. Старэйшы брат прыходзіць дамоў з перадавых пазіцый. Не, яго не адпусцілі, вайна не скончылася, ён проста пайшоў дамоў, і не таму, што баязлівец, ён пайшоў пад уплывам асобай філасофіі, філасофіі непраціўлення — спыніць забойства. Адна смерць вядзе за сабой другую. І калі ўбачаць ворагі, што людзі выйшлі з акопаў, разарвалі крывавы ланцуг забойстваў, яны самі разаб'юць вінтоўкі аб камень і вернуцца ў свае рубяжы. Старая маці разумее ўсю недарэчнасць развaжанняў свайго сына. Разгублена слухае яго малодшы, у гневе — сярэдні брат. Але ім не ўдаецца пераканаць Эдыла. Яму не месца ў іх доме. Эдыл гіне. Паўстаўшы супраць забойства, ён падае першай ахвярай. І забілі яго свае, родныя. Складаная дыялектыка жыцця. Хто мае рацыю? Аб гэтым трагедыя. Яна не аб Эдыле, не аб маці яго, якая ідзе на забойства сына ў імя гонару сыноў, яна аб малодшым, Мураце, якому жыць далей. Што ўспрымае ён з гэтай трагедыі? Ці асудзіць непраціўленне Эдыла, ці прыме цалкам велічную жорсткасць маці? Гэта галоўнае ў драме, якая гаворыць аб тым, як не проста выпрацоўваюцца ў чалавеку высокія этычныя прынцыпы.

Жакіеў — малады драматург. Маладая і другая пісьменніца — А. Радзіёнава, якая выступіла з п'есай «Генерал ад кавалерыі», прысвечанай генералу Брусілаву. Цікава, што самыя складаныя праблемы гісторыі і сучаснасці ўсё часцей пераходзяць з рук вопытных літаратараў да творчай моладзі.

Малады літаратар Г. Нікіцін піша п'есу з нечаканай назвай «Бедная Ліза» аб сённяшняй дзяўчыне, фабрычнай работніцы Лізе, аб яе жыцці, працы, каханні. Сцэны з карамзінскай «Лізы» як бы пераліваюцца ў сучаснасць. Але там, дзе гераіня Карамзіна зламана, наша сучасніца перамагае. І ёй уласціва пачуццё незалежнасці, свабоды, сапраўднага раўнапраўя ў грамадстве. Яе можна пакрыўдзіць, але нельга прынізіць. Сітуацыя прывяла Лізу Карамзіна да смерці, а сучасная жанчына чэрпае сілы ў жыцці грамадства, прымаючы цяжкі ўрок на шляху больш поўнага разумення жыцця.

З новымі п'есамі выступаюць і вядомыя драматургі. Іх героі як бы «чысцяць сябе пад Леніным». «Чалавек і глобус» — драма Віктара Лаўрэнцьева пра вучонага і яго адкрыццё. Гэта філасофская і ў той жа час жывая сучасная п'еса, правобразам героя якой стаў Курчатаў, яго жыццё і навуковы подзвіг.

Віктар Розаў не шукае новых фармальных рашэнняў, яго дабро ў другім — у адкрыцці новых пластоў чалавечых душ нашых сучаснікаў, самых звычайных людзей часу. Яго апошняя п'еса аб маральнай адказнасці жывых за ўсё, што адбываецца на зямлі і ў іх душах. Адзін з герояў п'есы «У маскоўскай кватэры» — пісьменнік, вядомы, прызнаны, які даўно ўжо жыве без клопатаў і трывог. Ён выдаецца, перавыдаецца нават апрача яго волі, проста па ўтоптанай дарозе аўтарытэтаў. Яшчэ ўчора ўсё ішло добра і звычайна, яшчэ ўчора ўсё задавальняла пісьменніка, але штосьці зрушылася ў грамадскім побыце і ў яго свядомасці. У цяжкай барацьбе з сабой, з традыцыйнымі поглядамі акружаючых пісьменнік прыходзіць да трагічнага і ў той жа час аптымістычнага вываду — прафесіянальнае жыццё пражыта дарэмна. Дарэмна аддаў ён дні справе, у якой быў адзінокім, неталенавітым, ашукваў сябе і сваіх чытачоў падробкай пад талент, падробкай пад праўду жыцця. Аптымізм тут асобы, той самы, што сфармуляваў у назве сваёй драмы «Аптымістычная трагедыя» — Усевалад Вішнеўскі. Гэта аптымізм разумення складанасці жыцця, аптымізм цяжкага самаадрачэння ў імя больш высокіх узлётаў духу, больш высокай ступені сумленнага служэння народу. Герой Розава, разумеючы сваё паражэнне, не складвае рук. Ён вяртаецца да сваёй ранейшай прафесіі, пакідаючы літаратуру тым, каму пад сілу яе радасці і яе болі. Бурыцца дом, утульны, абжыты і вялізны каменны дом, які для яго быў толькі картачным. Але ствараецца новы — дом сапраўднай праўды...

Немагчыма нават пералічыць усе новыя п'есы, якія яшчэ чакаюць свайго тэатральнага нараджэння. Але важна тое, што многія з гэтых твораў нясуць тую грамадзянскую і мастацкую атмасферу, якая робіць іх не проста новымі п'есамі, але і рэпертуарам цяперашніх адказных тэатральных сезонаў.

Іна ВІШНЕЎСКАЯ,
кандыдат мастацтвазнаўства.
(АДН).

НА філарманічнай сцэне —фартэпіяна, падобнае да чорнага крыла вялікай птушкі. І побач — чалавек. Зараз ён кране клавішы і — чароўная плынь музычнай споведзі запоўніць залу, растрывожыць нашы сэрцы, абудзіць светлы ці журботны роздум, успаміны... Перш чым пачаць іграць, у самыя апошнія хвіліны перад канцэртам артыст мабілізуецца. І, мабыць, абавязкова прыгадвае ўрокі чалавека, які даваў яму першыя парады і вучыў «азам» мастацтва. Хаця, бывае, што самым галоўным настаўнікам мы лічым не першага, а таго, хто пакінуў у нас самыя яркія ўражанні і навучыў быць самім сабой у творчасці.

Я ведаю многіх музыкантаў-выканаўцаў і педагогаў, для якіх такім—самым галоўным — настаўнікам быў і застаецца Міхаіл Аркадзьевіч Бергер.

Сціплы і патрабавальны, ён ведае музыку дасканала. Энцыклапедычныя яго веды здзіўляюць. Праўда, здзіўляюць толькі спачатку, а з цягам часу пераконваешся, што такі стыль яго жыцця: паглыбляцца ў стыхію музыкі, аддаючы ёй, вобразна кажучы, усе дваццаць чатыры гадзіны ў суткі. Бывае, ён адкрые такі нюанс у вядомым творы, што ты пачынаеш зусім інакш чытаць ноты наогул. А то дасць трапную характарыстыку віртуозу, і ты спяшаешся да магнітафона, каб пераканацца, што і сапраўды гэтаму музыканту ўласціва мужнасць ці, наадварот, сентыментальнасць, якую ён хавае за сваёй манерай выканання...

НАШЫ майстры МАСТАЦТВА

АКОРДЫ АДНАГО ЖЫЦЦЯ

Заслужанаму артысту БССР М. А. Бергеру — 60 гадоў

Таму ўрокі М. Бергера — гэта далучэнне вучня да музыкі. Ну, і, канечне, кожная сустрэча з маэстра адкрывае перад маладым нешта з «сакрэтаў» выканання і трактоўкі п'ес. Колькі старонак музычнай літаратуры ён перагарнуў разам са сваімі вучнямі, спадзеючыся, што з кожнага з іх нешта атрымаецца.

А сам ён пачынаў свой артыстычны шлях у бурныя гады грамадзянскай вайны. Юнак разам з Ларысай Александроўскай займаўся ў рабочай кансерваторыі, дзе ўся атмасфера была прасякнута маладым энтузіязмам і жаданнем хутчэй авалодаць майстэрствам. Міхаіл цікавіцца народнай музыкай. А калі ён вучыўся ў музычным тэхнікуме, да студэнтаў прыходзілі Янка Купала і Якуб Колас, і сустрэчы з чароўнай паэзіяй, з меладычнымі вершамі асабліва хвалявалі яго.

Станаўленне Бергера як музыканта адбывалася ў Ленінградзе, куды яго накіравалі на ўдасканаленне. У кансерваторыі ён вучыўся ў класе прафесара Л. Нікалаева. У Беларусі малады музыкант даваў канцэрты — сольныя і з сімфанічным аркестрам. Сустрэчы з выдатнымі выканаўцамі і дырыжорамі садзейнічалі пашырэнню музычнага светапогляду М. Бергера. Яго трактоўкі фартэпіяннай літаратуры класікаў і сучасных кампазітараў высока ацэньваюцца слухачамі і крытыкай.

Аўтарытэт гэты дае права Бергеру стаць на чале Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (1938—1941 гг.). Якраз тады, напярэдадні вайны, з гэтай навучальнай установы выходзяць маладыя кадры беларускіх музыкантаў і кампазітараў, якія цяпер складаюць моцнае ядро нашага музычнага жыцця.

Міхаіл Аркадзьевіч адразу пасля вызвалення былой Заходняй Беларусі шмат ездзіў па рэспубліцы, набіраў у кансерваторыю вучняў. І знаходзіў час, каб іграць на адкрытых канцэртах для рабочых Беластока, чыгуначнікаў Брэста, жыхароў Гродна і Ліды...

Інтэнсіўнае музычнае жыццё рэспублікі той пары захапляла музыканта. Ён пашырае свой рэпертуар і набывае каштоўны вопыт у педагогіцы. За актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і за выступленні на першай Дэкадзе беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве М. Бергеру было прысвоена ганаровае званне заслужанага артыста БССР.

Музыкай ён служыў і справе перамогі нашага народа над фашызмам. Па даручэнні ЦК КП(б) Беларусі Бергер арганізаваў Першую франтавую канцэртную брыгаду з музыкантаў нашай рэспублікі. Яна за першыя два гады вайны дала многа выступленняў для воінаў.

Беларускае радыё працавала тады ў Маскве — і там, узначаліўшы рэдакцыю музычнага вяшчання, Бергер аддае сваю энергію і талент, каб эфір даносіў да жыхароў акупіраванай тэрыторыі савецкую музыку.

Цяпер Бергер аддае сябе вельмі карыснай справе, якая захапляе яго цалкам — рыхтуе музычныя кадры. Можа, назваўшы некалькі імён вядомых дзеячоў мастацтва, мы дамо ўяўленне пра плён гэтай працы Бергера. У яго вучыліся кампазітар Уладзімір Алоўнікаў, лаўрэат міжнароднага конкурсу ў Будапешце В. Бельчанка, заслужаная настаўніца БССР Б. Бодніч... Галоўнай справай яго жыцця стала праца з вучнямі. Міхаіл Аркадзьевіч — настаўнік высокага класа, майстар педагогікі.

Адзначаючы яго 60-годдзе, мы і жадаем яму плёну і радасці на гэтай ніве, ніве, якая дае ўсходы штогод. Мабыць, гэта варта ўсяго жыцця — каб слухачы, аддаючы належнае таленту выканаўцы, з удзячнасцю называлі б і імя яго настаўніка.

С. МАДОРСКІ,
в. а. дацэнта Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

ДА ФЕСТЫВАЛЮ ПОЛЬСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

Сёлета адбудзецца ўсесаюзны фестываль польскай драматургіі, прысвечаны 25-годдзю стварэння ПНР. Беларускія тэатры прымуць у ім удзел.

Драматургія нашых суседзяў здаўна прыцягвала ўвагу творчых калектываў. На пачатку сваёй дзейнасці, у 1920 годзе Першы БДТ паказваў інсцэніроўку кнігі Э. Ажэшкі «У зімовы вечар» («Рысь»), а ў наступны сезон яе ж «Хама» і «Дамы і гусары» А. Фрэдра — спектаклі, якія зноў пабачылі святло рампы ў новай пастаноўцы ў 1957 годзе. На беларускай сцэне карысталіся вялікім поспехам творы Ю. Славацкага і Г. Запольскай, ставіліся п'есы сучасных драматургаў Кручкоўскага, Хайноўскага і Хаіньскага. Падзеяй быў спектакль «Страшны двор» С. Манюшкі на опернай сцэне.

У гэтым сезоне Брэсцкі тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі і Магілёўскі абласны паставяць інсцэніроўку вострасюжэтнага сучаснага твора «95—16» Яна Руцкага, а ў Гродна пойдзе «Пані Малішэўская» Г. Запольскай.

Эрнест Ялугін

ЛАДА

Малады празаік Эрнест Ялугін, які піша на рускай мове, надрукаваў сёлета аповесць «Камни Млечного пути» («Неман» № 3). Гэты твор можна лічыць сапраўдным дэбютам пісьменніка, хоць яго апавяданні і нарысы друкаваліся і раней.

Нядаўна Э. Ялугін скончыў працу над новай аповесцю для юных чытачоў — «Мстиславцев посох», якая прысвечана дзяцінству славутага беларускага друкара Пятра Мсціслаўца. Сёння мы друкуем раздзел з гэтай аповесці.

Пятрок чакаў Ладу на Дзявочай гары. Сядзеў пад пахілай агароджай, падстаўляў сонейку твар. У густых зарасніках бэзу на крутым паўднёвым схіле цяцёхкалі салаўі, нібы прачышчалі горла, рыхтаваліся да блізкага вечара. Тады ўжо салаўіны грай загучыць на ўсю моц. Цяпер жа птушак палохалі крыкі возчыкаў унізе, на Смаленскім гасцінцы. Дзень дагараў, і купецкія абозы спяшаліся да сутоння трапіць у горад. Каля варот, перад брамай, стаялі дзябёлыя стражнікі, здзіралі мыту—пошліну за ўезд, пакрыквалі на смердаў. Падводы ішлі ў два рады.

Лада з Петраком таму і любілі заходзіць сюды, што адсюль было добра відаць прыезджых. А Смаленскі гасцінец амаль ніколі не пуставаў. Цалюткі дзень ішлі і ехалі ў Мсціслаўль госці: грузна валюхаліся вазы з таварам з Масковіі і больш далёкіх краёў—з моцнымі абадамі, даўжэзныя, старанна прыкрытыя скурамі, увязаныя прасмоленымі вяроўкамі і сырамяццю. На пярэдніх і задніх фурманках абозаў узвышалася нешта падобнае на буданы. Там хаваліся возчыкі ад непагадзі, спалі ў дарозе,—і тырчалі адтуль іх боты з вузкімі халявамі, з вострымі загнутымі мысамі, густа заляпаныя жоўтым дарожным глеем.

А колькі цікавага на выгане перад Пасольскай слабадой! Тут цэлы гармідар з разнамоўнай гаворкі, іржуць коні, мычаць працяжна валы, бэкаюць, як перад закланнем, авечкі, клубкамі валіць чад з распаленых жароўняў, у горле пяршыць ад пылу і моцнага духу конскай мачы і смажанай бараніны з часнаком. Прыходзяць сюды з горада крамнікі па тавар для сваіх крамак—прыезджыя купцы перакідваюць ім на рукі цяжкія скруткі турэцкага аксаміту, малінавага, зялёнага, з залатымі і сярэбранымі ўзорамі; атлас нябесны; адамашку двухбаковую, кітайскую, індыйскую; у шырокія лазовыя кашы перакладваюць звязкі татарскіх саф'янавых боцікаў, бліскаць прывабна срэбназвонкія падкоўкі. Заўтра ўсё гэта з'явіцца ў мсціслаўскіх крамах, лаўках, непакоячы душы гарадскіх модніц, якіх ніколі не пакідае сверб падбіраць сабе ўсё новыя і новыя ўборы, спустошваць мужавы кашалі.

А ад заходніх, Магілёўскіх варот, калі паглядзець, ідуць у Мсціслаўль абозы нямецкіх гасцей: з варажскіх краін вязуць мячы, сякеры, спражкі, з Лівоніі—бурштын, з Германіі—віно, імбір, міндаль, соль. Што асядае ў горадзе, а што адпраўляецца далей, у Смаленск і Маскву.

«Багаты, слаўны наш Мсціслаўль»,—думае Пятрок, углядваючыся ў пярэстую людскую сумяціцу. Так і хацелася ўсё гэта намаляваць фарбамі або на бярозавай пласе выпаліць прутком тонкім, жалезным. Ды нельга: айцец Яўціхій павучае—маляваць патрэбна токма боскае, лікі і жыцці святых угоднікаў, а свецкае ж паказваць грэх. Ды цягнецца Петракова рука тварыць забароненае: востраю трэскай водзіць ён па вытаптаным ім гліняным голым схіле—вось мост цераз Віхру, вазы, барадатыя, з разяўленымі ратамі твары купцоў, кружок сонца зверху. Радасна Петраку, што сатварыў гэта, можа паказаць Ладзе—ну і пасмяюцца ж разам! Але не, грэх. І Пятрок таропка заціграе ўсё ботам.

Лада прыйшла падчапураная: у кончык спушчанай чорнай касы ўпляла кітайкі-стужкі шоўку рознаколернага, ускінула на сябе мяккі шарсцяны андарак—сіняе з чырвоным, з разводамі і ўзорамі, падперазала фартух з вышыўкамі, абула боцікі з кутасікамі. Пятрок воч не можа адвесці ад яе твару—горача-расчырванелага, з прамым тонкім носам, з малым падпухлым ротам, быццам трымае Лада губамі паспелую вішню. Бярэцца на нявесту Лада—пятнаццаць гадкоў стукнула, усяго на год менш, чым Петраку.

Паздароўкаліся. На пляскатым камені разаслаў Пятрок старую матчыну хустку, у якую дагэтуль былі старанна загорнуты дзве кніжыцы. Лада асцярожна ўзяла адну.

— Па ёй чытаць будзем?—яна села, паклала кнігу на калені, адгарнула з радасным здзіўленнем. Не падобная на папярэднія была кніга—і не тым, што была новая, але выглядам сваім: строй літарак асабліва роўны, прасветлены ды акруглены, у загалоўных літарах застаўкі з узорамі, што цешаць вока, у арнаменце па-майстэрску ўплецены знаёмыя травы і краскі, птушкі і звяры.

— Бацюшка Яўціхій зараз даў,—Пятрок садзіцца побач з Ладай, заглядвае ў кнігу.—Нашых зямель майстар зрабіў. Чытай...

Лада напаўголас выспеўвае: «Я, Францішак Скарынін сын з Полацка, у лекарскіх навуках доктар, павялеў сію псалтыр ціснуць рускімі літарамі і славянскай мовай дзеля памнажэння агульнага дабра і па той прычыне, што мяне міласцівы бог з той мовы на свет пусціў».

Пятрок паглядае на Ладу, пасміхаецца краечкам губ—добра яна чытае, і ў манастырскай школе пахвалу заслужыла б. Але пра тое, што ён вучыць Ладу чытаць і пісаць, ведае адзін Іпацій: дзе гэта чуваць было — грамаце дзеўку-прасталюдзінку вучыць! Яе клопаты—вілы, гаршкі ды кросны, палотны ткаць сабе на пасаг.

Лада была разумніца—літаркі схопвала адразу. Пятрок радаваўся яе поспехам і свайму настаўніцкаму ўмельству. Вучыў яе цярпліва і з толкам—не ў прыклад дыякану Гаўрылу: той мог у цяжкім месцы і псалтыром здзяжыць, каб лепш убіць грамату ў голаў вучня. Аднак Пятрок не быў у крыўдзе, калі і зарабляў—абы грамату адолець найлепей.

— А вось яшчэ паслухай,—Пятрок разгарнуў другую кнігу, чытае: «Людзям простым, паспалітым на карысць і памнажэнне добрых звычаяў, каб яны навучыліся мудрасці». Яшчэ ні ў адной кнізе не сустракаў Пятрок такога душэўнага слова да таго, хто будзе чытаць, здаваліся кнігі таму прышэльцамі з далёкага, чужога свету.

Пятрок сустрэўся поглядам з Ладай. «Што за вочы ў яе! Бы валошачкі ў жыце, як цёплы дожджык прамые,—думае ён.—Няма, бадай, такіх фарбаў, каб напісаць гэта пэндзлем».

Лада таксама прыглядваецца да Петрака.

— Хто гэта цябе?—убачыла яна сіняк.

Пятрок хмурыцца нагінаецца над кнігай.

— На перавозе,—ён муляецца.—Бярвенні мокрыя, скокнуў, пакаўзнуўся.

Лада асцярожна дакранулася да разбітай скроні вузкай халаднаватай далонькай. Пятрок заплюшчыў вочы.

Адразу—лягчэй неяк стала.

Лада заірдзелася, адняла руку. Пятрок стаў чытаць, але голас перахопвала: «Гэтыя кнігі карысна чытаць усякаму чалавеку, мудраму і прастарэку, багатаму і беднаму, маладому і старому; асабліва ж тым, хто хоча мець добрыя звычаі і пазнаць мудрасць і навуку. Бо ў сіх прытчах схавана мудрасць, бы моц у каштоўным камені і яко злата ў зямлі, і ядро ў арэху».

— Прыгожа як сказана,—гаворыць Пятрок і асякаецца пакрыўджана: Лада яго не слухае, глядзіць уніз.

— Глядзі, салавейка,—шэпча яна.—Шэранькі. Малюпахтанькі... І дзе ён толькі свой голас хавае? Ай, пырхнуў некуды! Гэта мы яго напалохалі.

Пятрок перастаў хмурыцца: як будзеш сердаваць на Ладу! А яна ўскочыла, засмяялася.

— Гайда ўніз!

Пабегла па крутым схіле, слізгаючы па маладой мураве, ныраючы пад галінкі,—вось ужо сіняе полымя андарака мільгае ў самай гушчыні бэзу, ужо каля дарогі срэбным званочкам звініць яе голас.

— Ау, Пятрок! Ау-у!

Ён скача з невысокага гліністага абрыву, як выпушчанае на волю зубраня, захіліўшы локцем твар, адважна ломіцца ў зялёную гушчэчу.

Іх заўважыў стражнік каля варот, знарок грозна прыстукнуў прыкладам мушкета.

— Гэць адсюль! Гэць!

Лада хапае Петрака за руку, знарок кругліць у страху вочы. Бягуць праз крутую дарогу, услед за фурманкамі, якія, мінуўшы браму, весела сакочуць коламі.

— Вой!—раптам спыняецца Лада, з шумам дыхае, і ад гэтага дыху выразна пукаюцца маленькія бугрынкі на грудях.—А кніжыцы?! Іх жа дамавы сцягне!

— Тут жа няма дамавых,—гаворыць Пятрок і таксама спыняецца.

Дзяржаўныя прэміі БССР

Абмяркоўваем вылучаныя творы

НЕРУШ ПАЭТЫЧНАГА БАЧАННЯ

Сярод твораў, вылучаных на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР, мы сустракаем зборнік вершаў Р. Барадуліна «Неруш».

Ад кнігі да кнігі сталее паэтычны голас Р. Барадуліна, набываючы новыя адценні і фарбы, а дыяпазон яго творчасці шырыцца і паглыбляецца. Крытыка ўжо не раз пісала пра самабытны талент паэта, пра яркую метафарыстычнасць і вобразнасць яго вершаў, пра тое, што яго творчасці ўласціва глыбокае пранікненне ў духоўны свет нашага сучасніка.

Чытаючы і перачытваючы кнігу «Неруш», нельга не заўважыць, як пашырылася «геаграфія» творчасці Р. Барадуліна, як дарожныя ўражанні ён, увасобіўшы ў канкрэтных вобразах, «пераплаўляе» ў сапраўдную паэзію.

Многія вершы ў гэтым зборніку пранізвае пачуццё светлай пашаны і ўдзячнасці да маці:

Вочы твае
нада мной узышлі
сузор'ямі цішыні,
сусветамі дабрыні,
покуль ёсць яны —
мне на зямлі
светла, мама...

Перад намі паўстае вобраз немаладой сялянкі-маці, з добрымі, трохі сумнымі вачыма, вобраз жанчыны, якой выпала нялёгкая доля — пазнаць жудасці вайны, перанесці смерць мужа-партызана, адной упраўляцца па гаспадарцы і гадаваць сына. Паступова ўзнікае адчуванне, што паэт малюе вобраз не толькі сваёй маці, — лёс мільёнаў жанчын адлюстраваны ў ім і вобраз гэты набывае шырокі сэнс, вырастае да вобраза маці-Радзімы.

Ты блаславўляла далоняй
кляноваю
сваіх сыноў.
Слязамі дабяла
бяліла лён на світку
Каліноўскаму
І Нёмнам ў сны
Ўрублеўскага плыла...
. . . .
Імя тваё нашчадкам з нетраў
выплыве —
Сівых стагоддзяў рэха:
— Бе-ла-русь!

Паэт шукае і знаходзіць яскравыя, выразныя, самабытныя словы і фарбы. Колькі музыкі, характва, свежасці ў такіх радках, як «рэха ў мяккіх пантоплiках падмоклым мохам ідзе», «цішыня тут, як дзеўка-пярэстарак, строгая», «з-пад доўгага брылька ружавашчокі глядзеў малы, як яблык з-пад лістка», «...было на ўсходзе сонца», «...чэрвень загарэлы дакошвае лугі — знаходзіць гнёзды, кладзе ў яе (шапку. — І. Ш.) цяплюткіх птушанят». Кожны гук роднай мовы для паэта «азяблай сініцай цінькае».

Паэта цікавяць самыя тонкія, на першы погляд не заўважныя праявы жыцця ў іх заўсёдным руху і абнаўленні. Ён умее неяк па-чалавечы пачуць, як нема крычыць злоўленая рыба, псіхалагічна адчувальна перадаць боль і абразу аленя, якому зразаюць панты.

Ашчадна выкарыстоўваючы кожны радок «жылплошчы» верша, глыбока пранікаючы ў свет чалавечай душы, перадае паэт настрой і пачуцці бацькі, які ў арцелі інвалідаў шые «на абедзве нагі сыну новыя боты».

Вершы Р. Барадуліна выклікаюць шмат асацыяцый, у іх амаль заўсёды ёсць «другі план», які з'яўляецца арганічным працягам настрою і думак, скандэнсаваных у паэтычных радках.

Рукі старога
дрэвы гаілі,
Як пеўня,
за глотку бралі агонь,—
Тысячарука
сосен галіны
Паўтарылі рукі яго.

У гэтых выразных экспрэсіўных радках з верша «Ляснік» паэту ўдалося пераканаўча намаляваць не толькі вобраз аднаго чалавека, але ўзвысіцца да высокага паэтычнага ўхвалення еднасці чалавека і працы. Наогул, тэма чалавека і працы цяпер загучала ў яго творчасці па-сапраўднаму выразна і хвалююча.

Гэтак жа кранаюць сваім высокім грамадзянскім гучаннем вершы, якія ўзнаўляюць у памяці выпрабаванні, што выпалі на долю нашага народа ў часы вайны. Успаміны людзей, маўклівая мова каменняў, тужлівы пошум лесу... Гэтыя сведкі як бы засцерагаюць чалавецтва ад новай пагрозы, патрабуюць настойлівай барацьбы за мір.

Мы — скрываўленыя камяні,
Мы хацелі для вас цішыні,
Людзі...

Прырода і чалавек у паэзіі Р. Барадуліна заўсёды ў непарушнай зладжанасці, дружбе.

Чытаючы зборнік «Неруш», мы ўваходзім у свет цудоўнага паэтычнага бачання. Такія кнігі дораць людзям багата хвілін добрай радасці.

І. ШПАКОЎСКАЯ,
настаўніца.

ЭКСПЕРЫМЕНТ УДАЎСЯ

Напэўна, ні адзін будынак сталіцы так не інтрыгаваў мінчан, як Палац спорту ў першыя месяцы пасля адкрыцця. Шмат што спрыяла гэтаму. І перш за ўсё тое, што архітэктурны лад яго быў новы, незвычайны. У формах палаца адчувалася нейкая ўпэўненая сіла і ў той жа час стромкасць. Здзіўлялі зала на 6 тысяч чалавек, лёдавае поле, якое магло ўзнікнуць за некалькі гадзін, незвычайнае фае, у якім не цесна тысячнаму натоўпу. Палац быў выдатным падарункам архітэктараў і будаўнікоў свайму гораду напярэдадні яго дзевяцісотгадовага юбілею.

Прайшоў час, сціхла першае захапленне, і сёння ўжо можна больш спакойна ацаніць плюсы і мінусы будынка.

За тры гады больш-менш ясна акрэслілася месца палаца ў забудове Мінска, стала ясна і яго роля ў планіроўцы Паркавай магістралі, адной з галоўных артэрый сталіцы. Палац спорту стаіць паблізу ад геаметрычнага цэнтра Мінска. Гэты факт, зразумела, накладваў на аўтараў — архітэктараў С. Філімонава, В. Малышава і інжынера В. Каржэўскага — немалую адказнасць, бо тут праз нейкі час будзе і асноўнае архітэктурна-планіровачнае ядро цэнтра Мінска.

Сёння ансамбль тут толькі распрацоўваецца. Няма яшчэ некалькіх манументальных будынкаў на лініі Дом мадэлей — гасцініца «Юбілейная». У асноўным старымі драўлянымі хаткамі забудавана яшчэ і Зарэчча, прастора на левым беразе Свіслачы, не склалася пакуль што аблічча зялёнага дыяметра горада, які пройдзе па беразе Свіслачы. Таму сёння Палац спорту стаіць у крыху сумнаватай адзіноце і многа ад гэтага траціць.

А Дом фізкультуры працоўных рэзерваў, які пабудавалі ў той час, калі палаца не было яшчэ і ў праектах, зусім не скрашвае гэту адзіноту, наадварот — ён толькі перашкаджае цэласнаму ўспрыняццю палаца. Прыземісты і цяжкі, падобны на старажытны манеж, ён быццам намагаецца дапасавацца да палаца, але толькі прызямляе яго, абцяжарвае.

Паміж Домам фізкультуры і Палацам спорту — пустэча. Як і ўсякая пустэча, яна сумная і ісці па ёй цяжка, лепей сказаць — нудна, а ісці трэба доўга. Напэўна разумна было б неяк расчляніць яе, магчыма ўжыўшы дэкаратыўную скульптуру ці прыгожую пасадку. Відаць, менавіта з гэтага і зыходзілі аўтары, калі запланавалі на падыходзе да палаца басейн з фантанамі, але ж ён не вырашае задачы, бо немаштабны ў адносінах да самога будынка.

Я наўмысна збіраю разам знешнія пралікі, бо ўсе яны перашкаджаюць нам як след убачыць тое прыгожае і цікавае, што безумоўна ёсць у Палацы спорту.

Будынак стаіць на невялікім узвышшы. Распластаны аб'ём і наўмысна геаметрычны, лёгкі контур — адпаведны архітэктурны «запіс» функцый будынка. Унутраная кампазіцыя аб'ёмаў лёгка чытаецца па галоўных лініях фасада. Парабалічны дах аб'ядноўвае трыбуны з падсобнымі памяшканнямі, нахіленыя апоры трыбун надаюць фасаду напружанасць і стромкасць, алюмініевая сетка прыгожага ўзору, запоўненая цёмным шклом, робіць дваровы фасад прывабным і ў той жа час надае яму дзелавы выгляд. А вось бакавыя фасады, на маю думку, маюць прыкметны пралік. Сцены падсобных памяшканняў глухія і таму глядзяцца як цяжкі дадатак да лёгкага па настроі будынка. Гэта акцэнтуецца яшчэ і тым, што якраз перад глухой сцяной абрываюцца вітражы фае. А калі дадаць сюды яшчэ буданчыкі кас, якія адміністрацыя паставіла менавіта ў гэтым месцы, бо спецыяльных памяшканняў архітэктары для іх не прадугледзелі, дык стане зразумелым, чаму гэты кавалак палаца выпадае з агульнага кампазіцыйнага ладу.

Палац спорту — назва не зусім дакладная, бо ён прызначаны не толькі для спартыўных спаборніцтваў, але і для масавых мітынгаў, канцэртаў, дэманстрацыі кінафільмаў. Універсальнасць залы і дала падставу аўтарам праекта прыняць размяшчэнне трыбун з аднаго боку. Гэта дазваляе лёгка трансфармаваць залу для канцэртных або спартыўных відовішчаў. Такое рашэнне было першым у нашай краіне і таму ў ім, зусім натуральна, шмат ад эксперыменту. Можа таму ў вырашэнні залы ёсць невялікія недаробкі (завялікія прыступкі, па якіх трэба падымацца да свайго рада), але наогул зала зручная ва ўсіх адносінах (акустыка, шляхі эвакуацыі, размяшчэнне месцаў) і, што вельмі прыемна, прыгожая... Строгія шпалеры сініх крэслаў (бадай што адзіны каляровы элемент палаца) спрыяюць прыўзнятаму настрою. Два балконы, прызначаныя для фотакарэспандэнтаў, ажыўляюць бакавыя сцены і быццам набліжаюць трыбуны да хакейнага поля альбо эстрады.

Асобнай гаворкі заслугоўваюць крэслы. Яны адштампаваныя са шклопластыку. Гэта з'ява даволі рэдкая. Напэўна ні ў адной зале рэспублікі такіх няма. Акрамя таго, менавіта тое, што яны не мяккія па-тэатральнаму, стварае той дэмакратычны настрой, якім заўсёды адрозніваюцца залы спартыўных комплексаў і стадыёны. І ў той жа час зала выглядае святочнай і добра ўпрыгожанай. Хацелася б адзначыць і яшчэ адно цікавае рашэнне, якое мае непасрэднае дачыненне да залы. І хоць яно больш інжынернага характару, аднак мае вялікае эстэтычнае значэнне. Памеры глядзельнай залы 66 на 64 метры. Памяшканняў такой плошчы, вольных ад калон, у нас у краіне не шмат. І хоць гэта, можа, і не надта вялікі тэхнічны цуд, але ж з'ява ўсё-такі незвычайная і таму ўражвае.

Залу з трох бакоў абдымае вялікае фае. Вітражнае шкло звязвае яго з акружаючым палац асяроддзем. У фае няма ніякіх упрыгожанняў, але тым не менш яно не безаблічнае. Інтэр'ер яго, вельмі дэкаратыўны і ўрачысты дзякуючы алюмініевым рамам вітражоў, беламу рыфлёнаму мармуру сцен, цікаваму мазаічнаму малюнку падлогі, абвітым шнурам калонам і мінімуму мяккай прыгожай мэблі ля сцен. Увесь гэты ансамбль разлічаны на вялікі натоўп, і ў той жа час чалавек у ім не губляецца.

Фае другога ўзроўню больш традыцыйнае, бо яно ўзнікла «само па сабе», — ніжняму фае патрэбна была столь, а гледачам верхніх радоў — месца для адпачынку. Таму верхняе фае грашыць выпадковасцю прапорцый, і гэта не ўдалося кампенсаваць аддзелкай і афармленнем. Адсюль жа, з другога ўзроўню, ёсць выхад на адкрытыя балконы, на дахі ніжніх фае. Гэта ўдалае рашэнне, бо дзякуючы балконам падкрэсліваецца сіметрычнасць верхняга і ніжняга фае.

Пралікам здаецца мне планіроўка цокальнага паверха, дзе размешчаны кафэ і санвузлы. Патокі людзей, што ідуць у кафэ ці ў туалеты, разбіваюцца адзін аб другі — дзверы гэтых памяшканняў насупраць. Да таго ж на гэтай плошчы цесніцца легіён курыльшчыкаў, бо ў фае ім курыць не дазваляюць. А гэта стварае дадатковы тлум.

Шкада і таго, што Палац спорту не мае сістэмы кандыцыяніравання паветра. Зала і фае вялікія, і таму вялікі цеплаабмен праз сцены, асабліва зімой. Ды і ўлетку тая вентыляцыя, якой абсталяваны гэты будынак, не можа стварыць аптымальных умоў. На тым баку, дзе сонца, — цёпла, на тым, дзе цень, — прахалода. Але трэба быць аб'ектыўным: зараз 1969 год — і то сістэм кандыцыяніравання ў нас не багата, а Палац спорту праектаваўся ў 1963 годзе, калі такія сістэмы лічыліся раскошай і калі выканаць іх было далёка не проста. Прыемна, што пры будаўніцтве палаца прымяняліся толькі айчынныя будаўнічыя і аддзелачныя матэрыялы, на той час зусім новыя. Тым больш прыемна, што і сёння, дзякуючы шырокаму набору і добрай якасці аддзелачных матэрыялаў — керамікі, алюмінію, шкла, шклопластыку і свяцільнікаў, гэты будынак выглядае гэтак жа сучасна і прыгожа.

Напэўна, не пашкодзіла б, каб Палац спорту перасталі так упарта абараняць ад светлавой рэкламы. Рэкламай абзавяліся універмагі, тэатры, цырк, адным словам усе аб'екты, што запрашаюць да сябе людзей. Толькі Палац спорту стаіць «урачыста» і «строга», быццам ён з тых, хто вышэй рэкламы. Зразумела, тут патрэбна цікавая рэклама, адпаведная стылю будынка, але гэта можна вырашыць, як кажуць, у рабочым парадку.

Палац спорту наведваюць за год мільён трыста тысяч чалавек. Гэтая папулярнасць тлумачыцца пэўна не толькі канцэртным рэпертуарам ці спартыўнымі праграмамі. Хадзіць у палац прыемна, тут утульна, ён адчуваецца «сваім». Палац увайшоў у жыццё горада, стаў у лік лепшых пабудоў сталіцы. І таму, улічваючы, што шмат у чым яго праектаванне і будаўніцтва было эксперыментам, думаю, ён заслугоўвае Дзяржаўнай прэміі БССР.

К. ТАРАСАЎ,
інжынер.

ВЕЧНЫ РЭВАЛЮЦЫЯНЕР

Да 220-годдзя з дня нараджэння А. М. РАДЗІШЧАВА

«Я взглянул окрест меня, и душа моя страданиями человечества уязвлена стала». Ва ўсёй рускай літаратуры знойдзецца не шмат радкоў, якія параўналіся б з гэтым непрыдуманым афарыстычным стогнам душы. Пасля ўжо Талстой скажа: «Не магу і не хачу маўчаць», пасля ўжо Дастаеўскі «возопиет», што слёзы аднаго дзіцяці не вартыя ніякай сусветнай гармоніі, але, бадай, найперш гэта пайшло ад яго, рэспубліканца, вольнадумца, рускага пана з галавой да дзіўнага падобнай на галаву Рабесп'ера. Адзін век выспеліў іх, толькі лёс быў па-зразумеламу розны: у аднаго прымусовая смерць ад рукі найміткі, у другога... урэшце, таксама прымусовая... Яму не заставалася нічога болей, і ніхто не ведае, як было ў яго там, сам-насам. Кажуць, ён атруціўся. Мусіць, гэта «па-руску».

Проста ён быў сынам свайго веку, лепшым з яго сыноў, — і яшчэ — па-сапраўднаму рускім і, як шмат хто, шукаў ён праўды за мяжой, але, пазнаўшы яе, рынуўшыся сцвярджаць яе існасць, надламаўся і апаў. І шмат хто думаў, што ён не перамог. А ён перамог.

Пра яго думаў Пушкін. Для Пушкіна ён таксама быў загадкай, той, якая вабіла да сябе і якая пакуль што не вырашалася. Пушкін думаў пра дзекабрыстаў. Абысці іх, гэтую з'яву, як сказалі б сёння, ён не мог. Ён пісаў «Во глубине сибирских руд». І пісаў «Клеветнікам России». У яго былі складаныя адносіны з Міцкевічам. Пры ім пісалася «Гора ад розуму». У падарожжы ва Эрзрум напаткаўся яму труп Грыбаедава.

Пушкін быў, бадай, адзіны, якому пра ўсё даводзілася думаць.

Той век быў такі. Не Пушкіна, а Радзішчава век.

Патрэбна была Кацярына, каб дурыць уяўным свабодалюбствам галовы еўрапейскім філосафам, патрошку крэмзаць камедыйкі і на гэтай падставе заціскаць зноў жа пастромкі Фанвізіных і Навіковых. І патрэбен быў Пацёмкін, каб пашыраныя межы імперыі аздабляць прыгожа. То было самаўладства, царызм, і адзін чалавек не вытрымаў.

Як не вытрымалі пасля дзекабрысты.

Той, першы чалавек, быў Радзішчаў.

А пасля былі дзекабрысты.

Іх подзвіг, іх трагедыю хораша растлумачыў Ленін.

Існуе бессмяротная кніжка — «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву».

Мы пачалі з Пушкіна. Вернемся зноў да яго.

Пушкін уважліва чытаў «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву». Здабыць гэтую кніжку яму было цяжка, як цяжка было, мусіць, мець над сабой уласным цэнзарам цара. Цар, урэшце, дапусціў яго да патаемных архіваў.

Не забудзем, што Пушкіна цікавілі аднолькава Радзішчаў і Пугачоў. Таму, што Пушкін не любіў самаўладства.

Пушкін задумаў «Современник». У расійскім дзяржаўным горадзе пільна, уважліва глядзелі на яго вочы: аднаго, таго, хто быў «в мещанской дворянии» (Булгарын) — і другога, нашчадка, «первого российского помещика» (Мікалай Першы). Той, што перад ім таксама быў першы. Толькі Аляксандр. Яму пашчасціла: не давялося вешаць дзекабрыстаў.

Пушкін да сваёй нататкі пра Радзішчава, якая прызначалася для «Современника», ставіць эпіграф, нібыта ўзяты ў Карамзіна: «Не трэба, каб сумленны чалавек быў варты павешання». Карамзін так можа і не гаварыў. Пушкін сказаў тое, што хацеў.

Яшчэ ён сказаў: «Дробны чыноўнік, чалавек без усякай улады, без усякага апірышча, рызыкуе ўзброіцца супраць агульнага парадку, супраць самаўладства, супраць Екацярыны!»

Пушкін па-свойму, у свой час, зайздросціў яму, Радзішчаву.

Радзішчаў яшчэ быў і паэт. Прачытайце ягонае «Осьмнадцатое столетие», выдатны верш, які, можа, першы ацаніў зноў той жа Пушкін. Там ёсць усё: зварушлівая «урна времян», з якой, як кроплі, падаюць стагоддзі. І гады, і Марс, які свеціць барвяным і напружаным вокам, вяшчуючы «мор и глад», — і многае-многае іншае...

Пра яго можна было б сказаць так: «Вечны рэвалюцыянер». Сказалі гэта пасля і не аб ім, але, можа, памятаючы яго...

Міхась СТРАЛЬЦОЎ.

ДА ВЯРШЫНЬ ШЛЯХ СКЛАДАНЫ

Мая дружба з кіно пачалася даўно, у тыя гады, калі на экранах з'явіліся першыя стужкі Сяргея Эйзенштэйна і братоў Васільевых. Менавіта тады мне давялося пазнаёміцца і з некаторымі беларускімі стужкамі: «Першы ўзвод», «Кастусь Каліноўскі», «Хвоі гамоняць». Яны прывабілі мяне свежасцю, чысцінёй, шчырасцю, высокім грамадзянскім пафасам. Яны многаму вучылі, дапамагалі разабрацца ў складаных пытаннях жыцця. Я аказаўся адналюбам — назаўсёды застаўся верны беларускай студыі і з хваляваннем сачу за кожнай стужкай, якая выходзіць з маркай «Беларусьфільм». Як сапраўдны сябар (а мне здаецца, што я маю права так сябеназываць) уважліва сачу за нараджэннем кожнай новай стужкі гэтай студыі. І лічу сапраўдным святам, калі фільм атрымлівае цца, калі стужка, створаная намаганнямі калектыву становіцца здабыткам мастацтва. Радуюся, калі фільм па-сапраўднаму хвалюе, калі ў ім вырашаюцца вострыя надзённыя пытанні часу, калі ён на высокім мастацкім узроўні. І вельмі горка бывае, калі пасля прагляду кінакарціны, пакідаеш глядзельную залу з пачуццём нездавальнення, калі на душы пуста... На жаль, так бывае...

Нядаўна я паглядзеў новую работу беларускіх кінематаграфістаў «Іван Макаравіч» (рэжысёр Ігар Дабралюбаў). Той час, у які адбываюцца падзеі фільма, я добра памятаю. Майму пакаленню прыйшлося на сваіх плячах вынесці яго цяжар. На фронце, у акопах, у партызанскіх атрадах, у тыле мы стараліся як мага хутчэй наблізіць перамогу. На суровых шляхах вайны, у напружаных працоўных буднях тылу, мы сустракалі нямала хлапчукоў і дзяўчынак, якія былі сапраўднымі героямі вайны.

Пра нялёгкі лёс хлапчукоў і дзяўчынак, якім давялося вельмі рана стаць дарослымі, дакладней кажучы, пра аднаго з іх расказаў у сваім фільме Ігар Дабралюбаў. Я спадзяваўся сустрэцца з новым цікавым творам, у якім не проста расказваецца аб знаёмых падзеях ваеннага часу, а ў якім гэтыя падзеі па-свойму асветленыя. Аднак, гэтага, не здарылася. Я ўбачыў фільм па-добраму сярэдні, не выдатны, на жаль. Сюжэт стужкі далёка не арыгінальны. Дарэчы кажучы, амаль аднача сова з «Іванам Макаравічам» на экраны краіны выйшаў фільм аб лёсе дзяўчынкі ў час вайны («Зімовая раніца»), і лёс яе напамінае лёс Івана Макаравіча. Нельга сказаць і аб «адкрыцці» цікавых глыбокіх характараў, аб рэжысёрскіх знаходках, якія паставілі б фільм у адзін рад, ну, напрыклад, з такімі стужкамі аб дзецях, як «Іванава дзяцінства» Таркоўскага альбо «Звоняць, адчыніце дзверы» Міты. Таму мяне вельмі насцярожыла тое, што фільм «Іван Макаравіч» вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР.

Канчатковае вырашэнне гэтага пытання, натуральна, кладзецца на кваліфікаваных спецыялістаў. Я хачу сказаць, што такой высокай узнагароды дастойны лепшыя з лепшых — выдатныя высокамастацкія творы. Фільм, які атрымаў прэмію, становіцца нібы эталонам для іншых.

Ігар Дабралюбаў мне здаецца чалавекам здольным. Але да вяршынь яшчэ трэба ісці і шлях гэты складаны. Я жадаю яму ўдачы.

І. БЕЛЯКОЎ,
інжынер.

ШТО ЧЫТАЦЬ ПРА ТВОРЫ, ВЫЛУЧАНЫЯ НА ПРЭМІІ

Рыгор БАРАДУЛІН. Неруш. Лірыка.

Яфімаў Ф. Вяртанне да крыніц. «Дружба народов», 1967, № 6.

Гніламёдаў У. Вобразы і мікравобразы. «Літаратура і мастацтва», 1967, 27 чэрвеня.

Сіпакоў Я. Акіян святла. «Маладосць», 1967, № 7.

Гаўрусёў С. Лёс, сонцам наканаваны. «Чырвоная змена», 1967, 5 жніўня.

Стральцоў Б. Шукаючы неруш. «Беларусь», 1967, № 11.

Захараў Б. Слова пра бацькаўшчыну. «Віцебскі рабочы», 1967, 28 сакавіка.

Няхай Р. Неруш — харошае слова. «Літаратура і мастацтва», 1968, 16 жніўня.

Лукша В. Знітаванасць з жыццём. «Звязда», 1968, 9 жніўня.

Ганчароў А. У адказе за ўсё зямное. «Советская Белоруссия», 1968, 17 жніўня.

Кіслік Н. Добрыя і розныя. «Літаратура і мастацтва», 1968, 3 верасня.

Ліякумовіч Ц. Адданасць самаму дарагому. «Літаратура і мастацтва», 1968, 27 верасня.

М. Кацюшын. Паэзія пачуцця і праўды. «Настаўніцкая газета», 1969, 9 жніўня.

ДА ЮБІЛЕЮ І. П. КАТЛЯРЭЎСКАГА

Пад старшынствам акадэміка АН БССР П. Ф. Глебкі 29 жніўня адбылося пасяджэнне юбілейнай камісіі па святкаванні 200-годдзя з дня нараджэння заснавальніка ўкраінскай класічнай літаратуры пісьменніка Івана Катлярэўскага.

З інфармацыяй аб падрыхтоўцы да ўрачыстасцей, прысвечаных юбілею класіка ўкраінскай літаратуры, выступілі сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. П. Шамякін, намеснік міністра культуры БССР Ю. М. Міхневіч, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку Р. В. Кучавалаў, рэдактар рэспубліканскай газеты «Звязда» М. І. Дзялец, намеснік старшыні прэзідыума праўлення Беларускага тэатральнага таварыства У. М. Стэльмах, рэдактар часопіса «Полымя» П. Н. Кавалёў, рэдактар часопіса «Неман» А. Я. Макаёнак, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па радыёвяшчанні і тэлебачанні А. А. Бараноўскі і іншыя.

У сваім рашэнні юбілейная камісія адзначыла шырокую падрыхтоўку творчых арганізацый і саюзаў да святкавання 200-годдзя з дня нараджэння І. П. Катлярэўскага. Адобрыла выхад з друку перакладнога выдання «Энеіда» класіка ўкраінскай літаратуры, зробленага народным паэтам Беларусі Аркадзем Куляшовым, брашуры, падрыхтаванай да друку Гомельскім дзяржаўным універсітэтам «І. П. Катлярэўскі і сусветная культура», якая выйшла ў выдавецтве БДУ.

Прадугледжана правядзенне ў сталіцы Беларусі ўрачыстага вечара, прысвечанага юбілею пісьменніка, а таксама шматлікіх выставак у бібліятэках рэспублікі, лекцый аб жыцці і творчасці І. П. Катлярэўскага.

БЕЛТА.

— Ну, але! Ён прыйдзе з дому і ўсё пахавае. Ды так, што не знойдзеш потым. Ведаеш, як дамавы любіць, калі што кідаюць без прыгляду.

Псалтыр ляжаў на камені разгорнуты, было відаць знізу, як варушацца старонкі. У Петрака пахаладзела ў грудзях: што, калі кніга так і знікне на вачах? Ён падбег першым, аддыхаўся, крыкнуў звонка:

— Гэта вецер, Лада, вецер!

Лада моўчкі ўзяла кнігу, загарнула, пацалавала, прыціснула да сябе.

— А бачыла ты дамавога? — Пятрок апускаецца на камень, вецер абвявае разгарачаны твар.

— І-і, колькі разоў, — зашаптала Лада. Яна склала кнігі, загарнула іх у хусцінку.

— Ну і які ён? — Пятрок адсоўваецца, дае Ладзе месца.

— Усякі. Якім яму захочацца, — Лада азіраецца на царкоўную агароджу, па якой рухаюцца барвовыя водбліскі захаду. — Бабуля мая колькі разоў яго бачыла, хатніка гэтага. Яго ўсякі можа ўбачыць: вазьмі толькі вечарам у царкве запаленую свечку і прынясі яе непатушаную дадому, і залезь у поўнач на гарышча. Тут ён і будзе ляжаць, хатнік. Прыкінецца катом ці сабакам, а то голым чалавекам, і ляжыць, глядзіць. Яго трэба абавязкова прыкрыць, тады ён стане ласкавы, і што толькі ні пажадаеш, споўніць. А яшчэ, калі ў каго ў хаце бяда, трэба хатніку аднос зрабіць — у чыстую анучку загарні солі і хлеба акрайчык ды на ноч і пакладзі пад паветку ці на вароты. А ранічкай паглядзі: калі няма на месцы адноса, значыць, хатнік яго прыняў, павядзе бяду з хаты. Калі ёсць — кепска.

Лада зноў павесялела, радасна глядзець на яе Петраку.

— Я і словы ведаю, каб хатніка ўлешчыць, — гаворыць яна.

— Гэта ж якія такія словы? — Пятрок слуха недаверліва.

— А от як бывае святочная вячэра, і пасядуць усе за стол, трэба сказаць у куток: «Цар дамавы, царыца-дамавіца, з малымі дзеткамі, калі ласка, з намі вячэраць». Вельмі гэта хатніку падабаецца.

Лада зіркае на Петрака, і раптам просіць:

— Ты б расказаў мне казку, а, Пятрок?

Пятрок не адзываецца, задумліва ўсміхаючыся, ён глядзіць уніз. Рачную лагчыну зацягвае туман-паўзун, ужо і дамы Пасольскай слабады патанулі ў ім па вокны. Лада прыхінаецца галавой да цёплага плечука Петрака, заціхае. «Зусім яшчэ дзіцё» — думае Пятрок.

— Што ж табе расказаць сёння? — гаворыць ён — акурат як дзед яго некалі. — Многа ўжо расказваў. Ну ладна, слухай...

Варушацца ў кустах палахлівыя цені, сціхаюць, глухнуць галасы на гасцінцы, за выганам сыпле дробненька перапёлка: «спаць пара, спаць пара, спаць пара»; заліўчата, бойка высвістваюць салаўі...

— ...Тут ударыў Удовін сын паліцай у пятнаццаць пудоў — камень і раскаціўся напалам, — роўна, напаўголаса і трошкі нараспеў вядзе казку Пятрок.

Лада, як кацяня, пацерлася аб яго плячо.

— Гэтую казку я ведаю, Пятрок, — гаворыць яна.

Пятрок змаўкае. Ну як тут засярдуеш, калі так добра чуць побач яе лёгкае дыханне, калі нават паварушыцца боязна!

— Раскажу тады пра смерць-куму, — гаворыць ён. — Але, цур, не баяцца.

— Вой, баюся! — Лада туліцца ямчэй. — Раскажы, Пятрок, раскажы.

— Не перабівай жа, слухай.

— Чалавек тут непадалёку жыў. Рамяство ведаў, жонку меў. Але вось бяда: дзетак у яго не было — народзіцца і тут жа памірае.

Пятрок чуе, як уздыхае Лада: ужо ёй і шкада!

— Вось зноў нарадзіла яго жонка, а тут і параіў яму нейкі вядун: пашукай куму такую ці кума, каб справядлівыя былі. Ну, чалавек і пайшоў у дарогу. Ідзе, сустракае папа. «Куды ногі нясуць, добры чалавек?» — пытае поп. — «Іду кума ці куму справядлівых шукаць». Поп і гаворыць: «Вазьмі мяне за кума!» — «Хто ты такі?» — «Поп я». — «Не, бацюшка, не вазьму: несправядлівы ты — з жывога і мёртвага дзярэш». Ідзі сабе далей. Сустракаецца яму шляхціц: «Куды ідзеш, чалавеча?» — «Іду кума ці куму справядлівых шукаць». — «Вазьмі мяне». — «А хто ты такі?» — «Яснавяльможны шляхціц польскіх крывей». — «Ну, гэта за вялікі гонар для нас. Не, не вазьму! Несправядліва б'еш, праваслаўны народ сячэш». Ішоў, ішоў чалавек, сустракаецца яму святы ўгоднік. «Куды шлях-дарога цябе вядзе?» — пытае. — «Іду кума ці куму справядлівых шукаць». — «Вазьмі мяне». — «А хто ты такі?» — «Святы ўгоднік». — «Не, не вазьму, — несправядлівы ты: у каго багацця многа, яшчэ даеш; у каго дзяцей многа, таму больш даеш». Забедаваў зусім чалавек, што не знойдзе справядлівых на зямлі, але ідзе далей. І раптам сустракае бабулю ў чорным: «Куды ідзеш?» — пытае. Чалавек і паведаў ёй сваю бяду. Старая разявіла чорную зяпу і гаворыць: «Мяне бяры». — «А хто ты будзеш?» — «Я — смерць». Задрыжаў чалавек, але гаворыць: «Цябе вазьму! Ты хоць і страшная, але справядлівая: морыш і папоў, і шляхту, і купцоў, і мужыкоў — нікому спуску не даеш: ні чэрні, ні знатным, ні за якое золата-серабро». Прывёў ён смерць у свой дом: ахрысціла яна хлапчаня, тое на вачах вясёленькае стала, крэпенькае. І гаворыць тады смерць такія словы: «Ты цяпер, кум, мяне бачыць будзеш, калі мы сваякі з табою. Ад гэтага ты станеш багаты. Хто прыхварэе, ідзі да яго — мяне там сустрэнеш. Буду я стаяць у хворага чалавека ў галавах, а ты яго лячы: вадою папырскай, скажы: «Аздараўляй!» А калі прыйдзеш да хворага, а я ў нагах у яго стаю і ў вочы гляджу, то не завіхайся, — скажы, што памрэ. Адно памятай — справядлівасць, якую і сам шукаў. А калі ля сваіх ног убачыш, не палохайся, мацуйся душою, бо бяды наробіш».

З тым і пайшла старая. Чалавек жа той скора моцным ведуном праславіўся: сталі яго вазіць за сто вёрст і далей, аддаюць яму ўсё, што маюць — і зямлю, і золата. А ён да гэтага хутка прывык: спачатку прымаў дарункі толькі ў тых, хто ачуньваў, а потым пачаў драць з усіх запар — яшчэ і слоўца не прамовіць, а яму ўжо падавай. Багатым стаў, харомы займеў, слуг, пахаджвае, пакрыквае, ніхто яму не раўня.

А тут паклікала яго ў госці кума, частуе. А ў кумы ў харомах палата адна велізарная, далёкай сцяны і не відаць. І гараць там свечы многімі радамі. Ён і пытае, кум у кумы: «Што гэта за свечы ў цябе, кумачка?» — «То ўсё душы чалавечыя». — «Кумачка, пакажы маю свечачку!» — «Глядзі, толькі не палохайся». І паказала кума яго свечку. А той свечкі з мезены пальчык, не болей засталося. «А чаго яна гарыць хутчэй, чым іншыя?» — «А гэта ад прагнасці бывае. Дый пра справядлівасць ты забыў». Глядзіць, кум, а побач нейкая свечка высокая-высокая гарыць, і роўненька так. «Чыя?» — пытаецца. «А шаўца з выгана. Ціха жыве, на чужое не зарыцца, бедным абутак рамантуе за дзякуй, хоць дзеці ў яго і па святах хлеб у квас мачаюць».

Кум і давай прасіць. «Кумачка, надтачы ты маю свечачку трошкі, усё ж такі мы сваякі». — «Не, у мяне для ўсіх аднолькава: ці сваяк, ці чужак». — «Ну, ладна, налі тады мне на дарогу яшчэ медавухі». Смерць адвярнулася, а кум хап шаўцову свечку, шась напалам і прыляпіў да сваёй. Хоць няроўная, але доўгая стала.

— Ах, зладзюга! — падхопліваецца Лада, горне кулачкі. Пятрок бярэ яе за руку, садзіць. — Слухай далей.

Дык вось, азірнулася смерць, а ў кума і душа ў пятхі. Але нічога, п'е медавуху. І раптам бачыць, што свечка яго не з воску, а з бярозы — так і палыхае. І медавуху не дапіў, з кумою не развітаўся, пайшоў дадому. Загадаў аднаму ўмельцу-цеслю такі ложак зрабіць, каб у два бакі можна было галавою спаць. А тут і захварэў, і лёг на той ложак, стаў слабець. Глядзь — а смерць ужо ў нагах, вочы — дзве ямы магільныя. «Пайшлі, — шэпча, — збірайся». А ён уздумаў куму абхітрыць — кувырк у другі бок галавою. А кума зноў зайшла з ног, глядзіць на яго, душу заварожвае. «Эй, слугі! — крычыць. — Абступіце мяне цясней!» Абступілі, загарадзілі — а смерць ужо над нагамі пырхае. «Зніміце з мяне бот!» — крычыць слугам. Кум узяў той бот, жалезам падкуты, ды як шпурне ў смерць. Бот праляцеў праз яе і абцасам-жалезам у скронь сынку. На месцы сканаў той. Зноў пачаў брыкацца, круціцца кум, ад смерці ўцякаць. Дык так і не ўцёк. Тут і казцы канец.

Пятрок ляпнуў сабе далоняй па калене, павярнуў галаву да Лады. Тая ўсхліпвала.

— Табе нядобра? — занепакоіўся Пятрок.

— Сынка шкада, — Лада выцірала вочы краем фартуха і нешта гаварыла яшчэ, але Пятрок не разабраў: блізка затрызвонілі царкоўныя званы.

— Гэта ж я на вячэрню спазнілася! — крыкнула Петраку ў самае вуха Лада. Пятрок таксама заспяшаўся: даўно чакала маці.

На ростанях, пад старымі ліпамі, развіталіся. Да бацькоўскага дома прасіла Лада блізка не падыходзіць — баялася, што суседзі падхопяць на язык.

Самота ахапіла Петрака — так хутка і непрыкметна мінула нядзеля, і трэба раніцой зноў вяртацца ў манастыр, цярпець прычэпкі дзяка і насмешкі Сымона з дружкамі. Кепска правёў нядзелю: награшыў, непатрэбную казку расказаў, на вячэрню не пайшоў. І яшчэ грэх: змоўчаў на споведзі пра стычку з Сымонам. І тым віну сваю ўзмацніў.

Вулічка слабады была ўся ў калдобінах, нярэдка хлюпалі пад нагамі памыі, што выплёсквалі сюды гаспадыні ў суботу. Некалькі разоў Пятрок спатыкнуўся ў цемры, ледзь не ўпусціў цяжкія кнігі.

У граковых гнёздах заблытаўся выгнуты срэбны волас маладзіка.

Пераклад з рускай мовы.

Караль ГУЛЬМАН

«ДЗВЕ МАЦІ Ў МЯНЕ, АБЕДЗВЮХ ЛЮБЛЮ...»

Нядаўна на Беларусі гасціла дэлегацыя нашых сяброў па зброі — былых славацкіх партызан і ўдзельнікаў руху супраціўлення, якія ў час вайны мужна змагаліся на нашай зямлі супраць агульнага ворага — фашызму. Іменна тут набывалі яны вопыт партызанскай барацьбы, які потым так плённа выкарысталі ў часе Славацкага нацыянальнага паўстання.

Адзін з членаў дэлегацыі апублікаваў у браціслаўскай газеце «Праўда» артыкул, які ў скарочаным выглядзе мы прапануем чытачу ў перакладзе А. Мажэйкі.

«Сучаснікі і патомкі! Схіліце галовы, тут спяць вечным сном тыя, хто не стаў на калені перад ворагам». Выбітыя на мармуры словы звяртаюцца да кожнага, хто спыніцца каля помніка на ўскраіне Мінска. Сосны і журботныя вербы ахінаюць сваім ценем магілы, дзе пахавана восемдзесят тысяч савецкіх салдат, партызан, жыхароў гарадоў і вёсак Беларусі.

І помнік гэты не адзіны ў ваколіцах Мінска. Там, на ўсход ад горада, дзе сёння ўстаюць новыя гмахі для сотняў тысяч людзей, ёсць яшчэ адзін помнік. Ён стаіць у чыстым полі, дзе некалі быў канцэнтрацыйны лагер і фашысцкі салдат на вежы мог адсюль без папярэджання скасіць кожнага, хто наблізіцца да калючага дроту. Вечны агонь палае каля падножжа помніка, на якім напісана, што ў гэтых мясцінах фашысты закатавалі 201 500 чалавек.

«Гэтыя помнікі — нібы заклік да свядомасці чалавецтва», думаю я, стоячы каля помніка з дэлегацыяй удзельнікаў руху супраціўлення. Мы ўшаноўваем памяць тых, што не схілілі галавы. І чым бліжэй знаёмімся мы з гісторыяй барацьбы беларускага народа, тым больш яскрава паўстае перад намі яго бязмежны гераізм...

Беларускі народ мужна ўзняўся на ворага. Кіраўнік дэлегацыі міністр Францішак Гагара сказаў у гутарцы з былымі сябрамі па зброі.

— Я не ведаю ва ўсім свеце народа, які так жахліва пакутаваў, але не ведаю і народа, які так гераічна трымаўся...

У беларускіх лясах невысокіх, але затое дрымучых, сабралася больш паўмільёна партызан — 199 брыгад.

І, ведаеце, чым ганарышся, калі стаіш сярод гэтых людзей і слухаеш іх гаворку? Ганарышся, калі слухаеш, напрыклад, былога легендарнага камандзіра Івана Дзмітрыевіча Ветрава, яго словы:

— Славакаў у нашых партызанскіх атрадах (толькі ў тых, якімі камандаваў генерал Ветраў) было больш за дзвесце пяцьдзесят. Добрыя былі хлопцы, адважныя, я часта іх успамінаю.

І ён вядзе нас у музеі да стэндаў, дзе іх фатаграфіі, імёны, і ўспамінае:

— Ага, вось Руда Заяц. Я перапісваюся з ім. Цяпер ён жыве ў Чэшскіх Будзеёвіцах. Помню я і Тэадора Пола, які ваяваў у Гомельскай вобласці.


Так узаемна пераплёўся, знітаваўся лёс гэтых людзей. Славакі і чэхі — у беларускіх лясах, а там, у Нізкіх Татрах, у Вялікай Фатры, у Інавецкіх лясах — савецкія партызаны, камандзіры пабраталіся з нашымі людзьмі. Цікава, ці ўспамінаюць сёння ў Новай Легоце Трэнчынскай акругі Васіля Сцяпанавіча Харытончыка? Яму некалі далі там званне ганаровага грамадзяніна. Арыгінал гэтага памятнага дакумента за подпісам старшыні і сакратара гарадскога нацыянальнага савета захоўваецца ў музеі. Тут жа і дакумент пра ганаровае грамадзянства А. М. Грынеўскага ў Фрыштэку. Ці не забылі іх, не адверглі ў дні, калі многіх ахапіў шал? Бо ў Савецкім Саюзе пры спатканнях — шчырых, сардэчных спатканнях — не забываюць.

— Мы ніколі не забудзем пра дні і ночы, праведзеныя разам у выстуджаных зямлянках, дзе вочы раз'ядаў дым, а рукі і ногі калелі ад холаду, у лесе, дзе на кожным кроку падсцерагала смерць. І не забудзем, як мы плакалі — так, мы, мужчыны, плакалі, калі вяртаючыся з аперацыі, павінны былі капаць магілу для Міколы, Сымона, ці Ёзэфа або Францішка.

Там, глыбока ў лесе, непадалёк ад вёскі Калодніца Уздзенскага раёна, куды некалі Францішак Герэк, шафёр з Гадоніна, прывёз перапалоханага да смерці нямецкага генерала да партызан, нашы гаспадары падвялі да яшчэ аднаго помніка — з зялёнага каменя. І тут ляжыць некалькі савецкіх, а разам з імі і славацкіх партызан. Іх магілы абсыпаны кветкамі. І каля гэтай магілы я пачуў прызнанне Караля Тамашчыка, члена дэлегацыі, пісьменніка, былога беларускага партызана.

— Беларускія лясы блізкія мне. Гэтыя беластвольныя бярозкі і гонкія елачкі пахнуць для мяне гэтак жа, як тады, калі мы тут білі агульнага ворага. Я пражыў тут частку сваёй маладосці. Беларуская зямля, яе людзі ўвайшлі назаўжды ў маё сэрца і я не магу не сказаць, што я адчуваю сябе напалову славакам, а напалову — беларусам. Нібы ў мяне дзве маці, аднолькава мне дарагія, і я аднолькава іх люблю...

Мінск, ліпень 1969.



На тэрыторыі студыі «Беларусьфільм» будуецца гмах старажытнага Кракаўскага універсітэта. У гэтым павільёне будуць здымацца эпізоды мастацкага фільма «Я — Францыск Скарына».

Фота Ул. КРУКА.

Куток калекцыянера

СВЯТА САВЕЦКАГА СПОРТУ

У Маскве на Цэнтральным стадыёне імя Леніна ў Лужніках закончылася IX летняя спартакіяда прафсаюзаў СССР, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

9 жніўня, у дзень адкрыцця спартакіяды, калекцыі філатэлістаў папоўніліся новай спартыўнай серыяй, якая складаецца з дзвюх марак і блока.


Маркі падрыхтаваны да друку мастаком Анатолем Зубавым. Аўтар блока — мастак Юрый Касарукаў.

На паштовай мініяцюры наміналам 4 капейкі намаляваны бягун ля фінішнай стужкі. Марка выканана ў спалучэнні чырвонага, чорнага і зялёнага колераў. На 10-капеечнай марцы — гімнаст выконвае практыкаванне на кольцах. Каляровая гама мініяцюры — зялёны, чорны і блакітны колеры. У правай частцы малюнка кожнай маркі дадзены эмблема і тэкст «IX летняя спартакіяда прафсаюзаў СССР». Зубцоўка — грабеньчатая. Памеры па перфарацыі — 30 на 42 міліметры.

На паштовым блоку паказаны спаборніцтвы па плаванні, фехтаванні, конным спорце, веславанні на каноэ, мастацкай гімнастыцы і баскетболе. Мініяцюра ў правым верхнім кутку блока паўтарае малюнак першай маркі серыі, у левым ніжнім кутку — тэкст «IX летняя спаракіяда прафсаюзаў СССР, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна». Блок шматколерны. Без перфарацыі. Памеры — 70 на 95 міліметраў. Намінал 20 кап.

Серыя надрукавана афсетным спосабам на мелаванай паперы. Нумары марак па каталогу — 3824, 3825. Нумар блока — 3826

Людміла КЕЛІМ.
(АДН).



Горкі, парк сельскагаспадарчай акадэміі...

Фотаэцюд В. БЫСАВА. (БЕЛТА).

«100 МАЛЮНКАЎ ЭЙЗЕНШТЭЙНА»

«100 МАЛЮНКАЎ Эйзенштэйна» — так называецца выстаўка, адкрытая ў залах Саюза мастакоў. 100 малюнкаў з тысяч, створаных вялікім майстрам на працягу жыцця. Гэта мала. І гэта вельмі многа — 100 малюнкаў вельмі таленавітых, якія адносяцца да ўсіх перыядаў і жанраў творчасці Эйзенштэйна. Малюнкі гэтыя ніколі не прызначаліся для экспазіцыі, але яны даўно і трывала занялі месца на выстаўках. Многія з іх шырока вядомы дзякуючы выданню альбомаў. Кожная новая сустрэча з творчасцю Эйзенштэйна становіцца падзеяй. Яна дазваляе яшчэ хоць на адну ступень наблізіцца да разумення той велізарнай з'явы культуры і мастацтва XX стагоддзя, якому імя — Эйзенштэйн. Малюнак набывае тут асаблівую каштоўнасць. Ён падводзіць нас да працэсу творчасці мастака як бы знутры.

Эйзенштэйн пачаў сваё творчае жыццё як мастак. Ён прыйшоў у кіно ад графікі і тэатра. Ён ствараў кіно як новы, дынамічны від пластычнага мастацтва. І адначасова ў гэтым працэсе сфарміраваўся Эйзенштэйн — мастак непаўторнай індывідуальнасці.

Нельга аддзяліць Эйзенштэйна-мастака ад Эйзенштэйна-рэжысёра. Дзве гэтыя галіны яго мастацтва ўзаемаабумоўлены, з'яўляюцца выказваннем адзінага творчага пачатку.

Малюнак не быў для яго ні падрыхтоўчай чарнавой работай, ні «хобі», моднай цяпер другой прафесіяй. Графічная спадчына Эйзенштэйна — гэта адзіная лінія творчага працэсу, арганічнага і заканамернага, гэта бесперарыўны ланцуг адкрыццяў і ўзбагачэння бачання.

Выстаўка, невялікая па аб'ёму, як пункцірам, акрэсліла шлях Эйзенштэйна-графіка ад юнацкіх малюнкаў, абачльных, але яшчэ ў дастатковай меры аматарскіх, да работ сталага майстра.

У іх не толькі змена стылістыкі, удасканаленне майстэрства. У графіцы Эйзенштэйна складваюцца новыя метады мастацтва выяўленчай рэжысуры. У чарнавых накідах сцэн і тыпажу, у абліччы міфалагічных і літаратурных персанажаў у кампазіцыйных практыкаваннях на выразнасць, нарэшце, у вялікай колькасці падрыхтоўчых малюнкаў да фільмаў крышталізуюцца новыя суадносіны плоскасці і прасторы, дынамікі і статыкі паказу.

Не выпадковая творчая роднасць Эйзенштэйна-графіка з такімі мастакамі, як Анарэ Дам'е, Валянцін Сяроў, Пабла Пікасо, Анры Маціс, Дзіега Рывера. Кожны з іх сваімі выяўленчымі сродкамі вырашаў праблему развіцця ў часе пластычнай формы на плоскасці.

Унутраная неабходнасць руху, развіцця вобраза наспявала ў выяўленчым мастацтве яшчэ да ўзнікнення кіно. Відаць, Эйзенштэйн больш за ўсіх «вінаваты» ў тым, што кіно стала не толькі візуальным, але і пластычным мастацтвам на яго новай дынамічнай мове.

Поўныя гумару іназіральнасці, вострага пачуцця характэрнасці ў перадачы сілуэта і жэсту, малюнкі студэнта Эйзенштэйна яшчэ даволі традыцыйныя і апавядальныя ў трактоўцы руху.

Тэатральны мастак і рэжысёр Эйзенштэйн у пошуках дынамічнай выразнасці формы звяртаецца да вопыту кубізму і канструктывізму. У яго дэкарацыях і касцюмах пачатковыя формы рэчаў разняты на прасцейшыя геаметрычныя формы. Вобраз сканструяваны, сабраны, пабудаваны з іх як новая, адменная ад жыццёвага прататыпу структура. Так мантаж становіцца прынцыпам Эйзенштэйна яшчэ да прыходу ў кіно.

«Стачка», «Браняносец «Пацёмкін» і «Кастрычнік» Эйзенштэйна створаны ўжо як творы, якія належаць новаму віду выяўленчага мастацтва. У фільме пластычны вобраз атрымлівае драматургічнае развіццё. Гэтыя фільмы зняты без падрыхтоўчых малюнкаў. Але з таго часу рух як няспыннасць, як працэс, як шматзначнае выказванне адзінай тэмы становіцца характэрным не толькі для кінематаграфічных работ Эйзенштэйна, але і для яго графікі.

Асаблівасці мексіканскага цыкла абумоўлены ўжо не толькі прыродай, бытам, мастацтвам краіны, чые старажытныя фрэскі, статычныя і манументальныя, напоўнены бесперапынным рухам лініі па мудрагелістаму лабірынту арнаментаў.

У мексіканскіх малюнках Эйзенштэйна рухомая лінія. Статычны замкнуты ёю сілуэт. Можа, тут адбілася адчуванне спыненага часу, якое здзівіла мастака на старажытнай зямлі. Але думаецца, што перадаць гэтае ўражанне іменна так мог мастак, чыё вока бачыць форму прадмета і яго рух як адзіны развіты ў часе і прасторы вобраз.

Усё часцей лінія, змяшчаючы статычны сілуэт, надае яму не толькі характэрную выразнасць, але і задае пэўны рытм руху. Гэта адносіцца да малюнкаў, нават непасрэдна не звязаных і з кіно. Але гэта адзін з элементаў таго працэсу, які стварае сістэму чыста кінематаграфічнага мантажу.

Лінейна-плоскасны малюнак да «Аляксандра Неўскага» вельмі дакладна адпавядае эпічнаму плоскасна-фрэскаваму тлумачэнню вобразаў фільма.

Развіццё выяўленчай тэмы ў «Іване Грозным» захоўвае музычна-рытмічны лад падрыхтоўчых малюнкаў. Але ён становіцца больш складаным, псіхалагічна насычаным. Таму рух прымаюць на сябе не толькі лінейная кампазіцыя кадра, але і светаценявое, маляўнічае рашэнне.

Малюнкі Эйзенштэйна вельмі арганічныя, яны перадаюць паэзію і драматургію мастацкага вобраза. Фільмы Эйзенштэйна перш за ўсё «убачаны», пабудаваны пластычна ў творчым уяўленні мастака, а потым увасоблены на экране сродкамі новага віду выяўленчага мастацтва.

Эйзенштэйн усё больш прыцягвае ўвагу даследчыкаў і гледачоў як графік. Гэтыя грані яго творчасці непадзельныя. Для Эйзенштэйна аказваюцца вузкія традыцыйныя вызначэнні прафесій. Даволі ёмістым застаецца, можа, толькі слова «мастак».

Надзея ВУЛЬФЕРТ,
мастацтвазнаўца.
(АДН).

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Ў ІСТРЫ

Да праслаўленых карцінных галерэй хутка прыбавіцца яшчэ адна. Яна не будзе іх «сваячкай» па сваіх маштабах, тым больш «саперніцай» іх сусветнай славе. Але задума яе стварэння, якая ўзнікла ў гарачыя ліпеньскія дні ў Маскоўскай арганізацыі мастакоў, не менш гуманная і цудоўная.

Гісторыя гэтай карціннай галерэі, якая пачынае папаўняцца экспанатамі, адкрываецца пісьмом, з якім звярнуліся да сталічных мастакоў працоўныя аднаго з падмаскоўных раёнаў. Гэтыя месцы, што атрымалі сваю назву ад сціплай рэчкі — Істры, выклікаюць у памяці імёны Чэхава і Левітана, якія правялі тут значную частку свайго жыцця.

Думка аб стварэнні ў Істры пастаяннай мастацкай выстаўкі была сустрэта з вялікім энтузіязмам не толькі маскоўскімі мастакамі, але і вядомымі калекцыянерамі. Экспанат, які паступіў першым, вельмі каштоўны. Гэта жанравы пейзаж «Дворык» шырока вядомага савецкага мастака Фёдара Багародскага, аўтара маляўнічых серый «Беспрытульныя» і «Матросы».

З асабістай калекцыі ўдавы прафесара Сурыкаўскага інстытута Аляксандра Салаўёва паступіла сем пейзажаў. Карціны «Лясок» і «Бліжэй да вечара», выкананыя ў рэалістычнай манеры, сагрэты вялікай любоўю і разуменнем заўсёды хвалюючай сваёй прастатой і сціпласцю рускай прыроды. Задуменная лірычнасць гэтага мастака несумненна набывае прыхільнікаў сярод аматараў жывапісу.

Упрыгожыць будучую галерэю і палатно сапраўднага члена Акадэміі мастацтваў Дзмітрыя Налбандзяна «Копы раскідала». Работам гэтага прызнанага майстра пейзажу ўласціва насычанасць настрою і каларытнасць, што падкрэслівае і падоранае палатно.

Не толькі жывапіс, але і творы графікаў, скульптараў увойдуць у экспазіцыю істрынскай галерэі. Работы, выкананыя пастэллю і тэмперай, прадаставіла ўдава вядомага тэатральнага мастака Анатоля Арапава. Яго творы захоўваюцца ў музеі імя Бахрушына і ў Траццякоўскай галерэі. У ліку падораных карцін — пейзажная серыя «На Істры», якая парадуе жыхароў, улюбёных у родныя мясціны.

З іншых твораў будучай галерэі хацелася б упамянуць работы Пятра Васільева, прысвечаныя ленінскай тэме, а таксама плакаты Барыса Яфімава.

Карцінная галерэя ў Істры — значная падзея ў жыцці не толькі жыхароў невялікага падмаскоўнага гарадка, але і творчай арганізацыі маскоўскіх мастакоў. Мастацкую выстаўку мяркуецца адкрыць сёлета ў лістападзе ў краязнаўчым музеі Істры. Там яна і застанецца на «вечнае жыхарства», што будзе навочным увасабленнем ва ўсе вякі актуальнага ленінскага запавету аб цеснай сувязі мастацтва і народа.

АДН.

Падзеі. Факты. Навіны

□ Грамадскасць Слуцка шырока адзначыла 50-годдзе савецкага кіно. У гэтыя дні ў кінатэатрах «Цэнтральны», «Беларусь» і «Дружба» дэманструюцца лепшыя савецкія кінастужкі. У «Цэнтральным» паказваўся фільм «На шляху ў Берлін». Перад гледачамі выступіў кінааператар студыі «Беларусьфільм» У. Акуліч. Ён расказаў, якіх поспехаў дамагліся кінематаграфісты нашай краіны за паўстагоддзе.

Л. БАЙЧ.

□ «Радзіма мая» — пад такой назвай адкрылася выстаўка работ беларускіх мастакоў у Пінскім краязнаўчым музеі. Экспануецца больш сарака палотнаў Я. Зайцава, В. Цвіркі, Р. Кудрэвіч, В. Сухаверхава, А. Шыбнёва, П. Гаўрыленкі і іншых.

М. ПРЫГОДЗІЧ.

□ Новыя сельскія бібліятэкі адкрыты ў вёсках Глініца, Жахавіцы, Лешня, Тварычаўка і Белая Мазырскага раёна. Цяпер у цэнтрах кожнага калгаса, сельсавета і саўгаса працуюць бібліятэкі. У іх кніжным фондзе больш 150 тысяч экземпляраў рознай літаратуры.

В. ХВАЙНІЦКІ.

НА «ЭКСПО-70»

У 1970 годзе ў Японіі адкрыецца Міжнародная выстаўка «Экспо-70». На ёй будуць шырока прадстаўлены мастацкія промыслы нашай рэспублікі. Сярод беларускіх экспанатаў наведвальнікі ўбачаць сувеніры са шкла, гліны, дрэва, саломкі, тканыя, вышываныя і іншыя вырабы народных умельцаў.

Будуць сярод іх і работы гродзенскага разбяра па дрэве Станіслава Быка. Яго майстэрства не раз адзначалася на абласных і рэспубліканскіх выстаўках народнага прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва. Для «Экспо-70» разбяр падрыхтаваў шмат сувеніраў. Сярод іх фігуркі зубра і іншых звяроў, а таксама шырока вядомы фальклорны герой — Несцерка.

Гэтымі днямі творы народнага ўмельца разам з экспанатамі Гродзенскай фабрыкі мастацкіх вырабаў адпраўлены на выстаўку.

ФАБРЫКА ЎПРЫГОЖВАЕ КВАТЭРЫ

У цэхах гэтай фабрыкі не вырабляюць мэблі, не ткуць дываноў. Але хатняя ўтульнасць, прыгажосць кватэр у многім залежыць ад яе прадукцыі. Гэта — Мінская шпалерная фабрыка. Яна выпускае за год «вопратку» больш чым для мільёна кватэр.

...Шпалерна-друкарскі цэх. Прыглушаны шум машын, рэзкі пах клею, фарбаў, паперы. Пасля нядаўняй рэканструкцыі тут устаноўлена восем новых друкарскіх машын. Кожная з іх можа выпускаць шпалеры ў 6—8 фарбаў.

Гэты цэх на прадпрыемстве самы «пражорлівы». Ён паглынае за год 140 тон фарбаў і восем з палавай тысяч тон паперы. Затое і аддача не маленькая — каля трыццаці мільёнаў трубак шпалераў самых розных узораў і колераў.

Зараз у вытворчасці на фабрыцы каля 150 узораў. Сярод іх вельмі зручныя і прыгожыя вільготнаўстойлівыя шпалеры. Яны пакрыты спецыяльнай эмульсіяй, што дазваляе іх лёгка мыць.

Прадукцыя Мінскай шпалернай фабрыкі вядома не толькі ў гарадах і сёлах Беларусі, але і ў многіх братніх рэспубліках.

КОНКУРС: СЕЛЬСКІ СЕРВІС

Якім павінен быць гандлёвы цэнтр вёскі? Цяпер, калі калгасныя і саўгасныя пасёлкі будуюцца па сваіх генеральных планах, комплексна, з улікам усіх патрэб, — пытанне гэта асабліва надзённае.

Каб зацікавіць спецыялістаў архітэктурай сельскага сервісу, каб лепш наладзіць гандлёва-бытавое абслугоўванне сельскага насельніцтва, Дзяржбуд БССР і Саюз архітэктараў Беларусі аб'яўляюць конкурс.

У задачу конкурсу ўваходзіць распрацоўка праектаў гандлёвых цэнтраў для сёл Беларусі на 1000—1500 і 2000—2500 жыхароў.

У конкурсе могуць удзельнічаць як асобныя спецыялісты, так і аўтарскія калектывы.

У праектах павінны быць улічаны вопыт масавага і эксперыментальнага будаўніцтва на вёсцы, вынікі раней праведзеных конкурсаў. Трэба прадугледзець выкарыстанне будаўнічых дэталей і канструкцый заводскай вытворчасці, мясцовых будаўнічых матэрыялаў, улічыць архітэктурна-мастацкія і бытавыя традыцыі сельскага насельніцтва рэспублікі. Будынкі могуць быць каапераванымі ці блакіраванымі — для будаўніцтва ў некалькі чэргаў.

У гандлёвым цэнтры павінны быць: прадуктовы і прамтаварны магазіны, сталовая, гасцініца, прадпрыемствы бытавога абслугоўвання (цырульня, кравецкая, шавецкая майстэрні, майстэрні па рамонце дробнага гаспадарчага інвентара, гадзіннікаў, прыёмны пункт хімчысткі, комплексны прыёмны пункт).

Праекты павінны ўлічваць прагрэсіўныя метады абслугоўвання ў гандлі, грамадскім харчаванні, службе быту і быць эканамічнымі.

Трэба мець на ўвазе магчымасць поўнага інжынернага забеспячэння аб'ектаў (водаправод, паравое ацяпленне, каналізацыя).

Улічваючы, што будаўніцтва будзе весціся падрадным спосабам, гандлёвыя цэнтры могуць распрацоўвацца поўназборнымі з жалезабетоннымі індустрыяльнымі канструкцыйнымі элементамі, зробленымі ў заводскіх умовах ці са сценамі з мясцовых матэрыялаў (цэглы, дробныя блокі і інш.). У спалучэнні з жалезабетоннымі перакрыццямі.

Вызначаны наступныя прэміі за лепшыя праектныя прапановы (рашэнні):

для населеных пунктаў на 1000—1500 жыхароў — адна першая прэмія — шэсцьсот рублёў, дзве другія прэміі па чатырыста, дзве трэція па дзвесце пяцьдзесят і дзве заахвочвальныя па сто пяцьдзесят рублёў;

для населеных пунктаў на 2000—2500 жыхароў — адна першая прэмія — семсот рублёў, дзве другія па чатырыста пяцьдзесят, дзве трэція па трыста і дзве заахвочвальныя па сто пяцьдзесят рублёў.

Усе праектныя матэрыялы (пад дэвізамі) здаюцца не пазней 1-га снежня ў Саюз архітэктараў БССР (Мінск, вуліца Карла Маркса, 14). З 1 па 10 снежня наладжваецца выстаўка праектаў, з 15 снежня — выстаўка прэміраваных праектаў.

Праекты, якія не атрымалі прэмій, але маюць пэўную цікавасць для сельскага будаўніцтва рэспублікі, могуць быць набыты за цану, роўную заахвочвальнай прэміі.

Усе найбольш рацыянальныя праектныя рашэнні будуць выкарыстаны для распрацоўкі тыпавых праектаў гандлёвых цэнтраў у вёсках Беларусі.

Зацверджана журы конкурсу. На чале журы — старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах будаўніцтва У. Кароль.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

2 верасня

Першая праграма. 9.10 — тэлебачанне — школе. Геаграфія. 5-ы клас. «Для чаго мы вывучаем геаграфію». 9.40 — «Першыя ноты». Кінанарыс. 10.00 — навіны (М). 10.15 — «Маршрутамі пяцігодкі». Перадача з Казані. 10.45 — «Мастацтва аперэты». Канцэрт (М). 16.45 — праграма перадач. 16.50 — навіны (М). 17.00 — «Масква — Сафія». Да 25-годдзя з дня звяржэння фашысцкай дыктатуры ў Балгарыі (М). 18.00 — «Панарама навін». (Уключэнне Брэста). 18.10 — месячнік бяспекі руху. «Аўтамабіль, пешаход, вуліца». 18.30 — «У нашых в'етнамскіх сяброў». Да 24-й гадавіны абвяшчэння Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам (М). 19.00 — «Нгуен Ван Чой». Мастацкі фільм (М). 20.30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — «Майстры мастацтваў». Заслужаная артыстка РСФСР Т. Дароніна (М). 22.40 — Тэлеаб'ектыў на сельскай будоўлі». «Індывідуальныя забудовы». 23.10 — іграе А. Ляончык.

Другая праграма. 18.00 — для дзяцей. «Светлячок». Перадача з Пярмі. 18.30 — дзіцячы экран. «Карбуда». Мультыплікацыйны фільм. 21.00 — экран паўторнага фільма. «Сельская настаўніца». Мастацкі фільм. 22.40 — старонкі музычнага календара. «Людвіг ван Бетховен» (М). 23.10 — навіны (М).

3 верасня

Першая праграма. 9.10 — тэлебачанне — школе. Біялогія. 10-ы клас. «Уводзіны ў агульную біялогію». 9.40 — «Кіраў у Азербайджане». Кінанарыс. 10.00 — навіны (М). 10.15 — «Табе, юнацтва!» Перадача з Мурманска. 10.45 — канцэрт ансамбля песні і танца Лідскага Дома культуры Беларускай ССР (М). 15.30 — праграма перадач. 15.35 — школьная фільматэка. «На дне». Фільм-спектакль. Першая і другая часткі. 18.20 — «Панарама навін». 18.30 — бібліятэка беларускай паэзіі. Анатоль Вялюгін. «Выбранае». 19.00 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 19.30 — праграма каляровага тэлебачання. На Кубак уладальнікаў кубкаў. «Тарпеда» — «Рапід» (Аўстрыя) (М). 21.15 — «Дзелавыя сустрэчы». Сёння і заўтра сельскага гандлю». 21.45 — «Марскія апавяданні». Мастацкі фільм. 22.55 — «Мелодыі беларускага кіно». Канцэрт (паўтор). 23.45 — навіны (М).

Другая праграма. 16.50 — навіны (М). 17.00 — для школьнікаў. «Расказы пра мастацтва» (М). 17.30 — «Мы — камуністы». Тэленарыс (М). 18.00 — праграма каляровага тэлебачання. Перадача з Кіева. 21.15 — творчае аб'яднанне прыгод і фантастыкі. І. Лебедзеў. «Канец чорных рыцараў». Прэм'ера тэлеспектакля (М). 22.45 — у эфіры — «Маладосць». Гарызонт». Перадача з Ленінграда.

4 верасня

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — школьная фільматэка. «Пушкін». Дакументальны фільм. 18.00 — «Панарама навін». (Уключэнне Гродна). 18.20 — да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. «У адзінай сям'і». Перадача сёмая. Беларуска-казахскія літаратурныя і культурныя сувязі. 19.00 — праграма каляровага тэлебачання. «Каханне пры нулі градусаў». Мастацкі фільм (М). 20.30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — опера М. Рымскага-Корсакава «Пскавіцянка». Прэм'ера тэлевізійнага музычнага спектакля (М). 22.35 — «Рэха спартыўнага свету» (М). 23.05 — навіны (М).

Другая праграма. 17.00 — навіны (М). 17.15 — літаратурны тэатр. «Цюльпаны і кавылі». Па апавяданнях А. Мас (М). 18.00 — для школьнікаў. «Сто задум двух сяброў» (М). 18.30 — «Маршрутамі пяцігодкі». Перадача з Пензы. 20.30 — нашы госці — артысты Жытомірскага музычнага драматычнага тэатра. 21.10 — рэклама, аб'явы. 21.20 — экран кароткаметражнага фільма. «Хлопчык і стары».

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856. АТ 17208